№ 20 (522) 1 чэрвеня 2007
www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА
ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Маладафронтаўцы застаюцца на свабодзе



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

За вызваленьнем трох палітвязьняў — мяккі прысуд маладафронтаўцам. Усё гэта напярэдадні рашэньня Эўрасаюзу аб гандлёвых прэфэрэнцыях. Суд над МФ — **старонка 4.**

**Чаша гэтая мінула: палёгка Алега Корбана, аднаго з абвінавачаных па справе Маладога фронту.**

## Кангрэс па сцэнары Калякіна

Дэмакратычныя сілы перайшлі да калектыўнага кіраўніцтва. Непакоі: ці няма за гэтым рукі Масквы? Кангрэс дэмакратычных сілаў — **старонка 6.**

Аляксандар Мілінкевіч нязгодны з прынятай стратэгіяй і гуртуе прабеларускія сілы. Піша Зьміцер Панкавец. **Старонка 7.**

Кангрэс-2007 быў увэрцюрай да змаганьня за пасаду кандыдата-2010. Піша Барыс Тумар. **Старонка 8.**

Цёмнай была ідэя Кангрэсу, цёмнымі былі крытэры выбару дэлегатаў, цёмнай была геапалітычная арыентацыя «айцоў Кангрэсу». Піша Пётра Рудкоўскі. **Старонка 10.**

### Нафтавыя арышты

КДБ затрымала дырэктара «Белнафтахіму» Аляксандра Бароўскага і шэраг буйных бізнэсоўцаў, імёны якіх на момант здачы нумару не паведамляліся. **Старонка 3.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# У нумары

## люстра дзён

Маладафронтаўцы застануцца на свабодзе 4
Дэмакратычныя сілы перайшлі да калектыўнага кіраўніцтва ... 6
«Адмоўся ад сваёй ідэалёгіі і застанесься вучыцца» ... 16

## камэнтары

Барыс Тумар. Апазыцыя падзялілася на рускіх і нярускіх ... 8
Мікола Бугай. Бюракраты баяцца герояў ... 9
Аляксандар Класкоўскі. Бура ў шклянцы вады ... 9
Пётра Рудкоўскі. Калгас дэмакратычных сіл 10
Віталь Тарас. Трымценьне вейкаў ... 12
Павал Севярынец. Свабода ... 14

## мы самі

Дзякуй за ахвяраваньні! ... 17

## культура

Каляндар на чэрвень ... 27
Вучань Рушчыца, сябар Сеўрука, сваяк Талстога ... 27
Мова як аптымізм ... 27
«Дзядзька Лявон ідзе!» ... 28
Вечар беларускай культуры ў Пльзэні ... 28
«Залатую галіну» Канаў атрымала румынская драма пра аборты ... 28

## аб усім патроху

Незвычайная для вясны сьпёка, Сыход, пра які можна пашкадаваць, У абарону Горадні падпісаўся кожны трохсоты, 40 000 даляраў і 40 000 эўра... ... 29

## газэтка дзеткам

Альфабэт ... 30

## вольны час

Рок за баброў, сустрэча з Сабілам і Севярынцам, мастакі і Рыгор Барадулін, Мікола Купава ў Нью-Ёрку, вежы і замкі Алеся Ліпеня... ... 31

### РЭДАКЦЫЙНЫ КАМЭНТАР

# Чатырохтыднёвая лібэралізацыя

За мінулыя 10 дзён былі вызваленыя тры палітвязьні, спыненыя некалькі палітычна матываваных крымінальных справаў, вынесеныя мяккія прысуды маладафронтаўцам і ніводзін чалавек ня быў пакараны арыштам за палітыку. Гэтыя рашэньні выносяць тыя самыя судзьдзі, якія яшчэ месяц таму бязьлітасна садзілі за тры ўлёткі. Ходзяць чуткі пра ўгоду Пяткевіч-Крэмэра, паводле якой беларускія ўлады маюць вызваліць усіх палітвязьняў да 10 чэрвеня, а ў якасьці кроку ў адказ некалькі эўрапейскіх саюзьнікаў ЗША заблякуюць зьняцьцё гандлёвых прэфэрэнцый для Беларусі. Рашэньне аб прэфэрэнцыях мае быць прынятае 21 чэрвеня. Нядоўга засталося чакаць, каб пабачыць, як далёка зойдзе гэтая гульня.

Ня будзем падманвацца. Палітвязьняў вызваляюць не таму, што за грамадзянамі раптоўна прызналі права на выказваньне незалежных палітычных поглядаў ці захаваньне нацыянальнай культуры. Не таму, што адмовіліся ад манаполіі на ўладу. Гаворка ідзе пра звычайны розыгрыш у абмен за фінансавыя выгады, за шчасьце спажыўцоў — каб эканамічная стабільнасьць умацавала рэпрэсіўную сыстэму. Больш за тое, прапаганда выкарыстоўвае сытуацыю, каб яшчэ раз абылгаць дысыдэнтаў, выдаўшы іх за агентаў Захаду. Прыгадваецца, як ГДР дазваляла Заходняй Германіі выкупаць палітвязьняў. Дзеля прапагандысцкага эфэкту Хонэкер на кожнага палітычнага ў нагрузку яшчэ даваў два крымінальнікі.

Адначасова з вызваленьнем палітвязьняў працэсы на месцах працягваюцца ў звычайным парадку. Выдатніка Юрася Алейніка ідэолягі выганяюць з Акадэміі кіраваньня за палітычныя погляды і не саромеюцца гэта прызнаваць (**старонка 16**). Ніякага праўдзівага раўнапраўя ў краіне ня будзе, пакуль ня будзе дэмантаваны рэпрэсіўны і прапагандысцкі апарат ідэалягічнай вэртыкалі.

Гледзячы на радасныя твары юнакоў і юначак з Маладога фронту, міжволі параўноўваеш іх зь дзеячамі мінулага. Такімі як Расьціслаў Лапіцкі, чый нацыянальны подзьвіг адкрыў гісторык Міхась Чарняўскі. Якое шчасьце, што яны жывуць у лепшы час, чым Расьціслаў. Гутаркай з Чарняўскім адкрываецца чарговы Гістарычны сшытак «НН» (**старонка 18**). У сшытку таксама знойдзеце інтрыгоўны археалягічны артыкул сп.Крывальцэвіча, рэцэнзію на новую кнігу Алега Латышонка, успаміны пра рух хіпі ў падсавецкі час.

Вялікую тэму складаюць матэрыялы пра Кангрэс дэмакратычных сілаў (**старонкі 6—11**). Як піша Пётра Рудкоўскі, ад самага пачатку цёмнымі былі мэты і матывы гэтага мерапрыемства. Многія камэнтатары зь непакоем заўважалі расейскія ніткі, што віліся вакол форуму. Аднак у самім падзеле на многапартыйную кааліцыю і Рух за Свабоду трагедыі няма, у гэтым сыходзяцца і Рудкоўскі, і Аляксандар Класкоўскі. Палітыкам цяжэй будзе звальваць адказнасьць з адной галавы на другую, а канкурэнцыя стане больш выяўнаю.

# Затрыманыя дырэктар «Белнафтахіму» і буйныя бізнэсоўцы

Затрыманы старшыня дзяржаўнага прадпрыемства «Белнафтахім» Аляксандар Бароўскі. Яго падазраюць у крадзяжы і злоўжываньні службовым становішчам.

Затрыманы старшыня дзяржаўнага прадпрыемства «Белнафтахім» Аляксандар Бароўскі. Яго падазраюць у крадзяжы і злоўжываньні службовым становішчам.

Пра гэта сёньня на прэсавай канфэрэнцыі паведаміў Генэральны пракурор Беларусі Пётар Міклашэвіч. А.Бароўскі (**на фота**) знаходзіцца ў сьледчым ізалятары. У яго канфіскавана шмат грошай і матэрыяльныя каштоўнасьці.



У інтарэсах следзтва КДБ не паведамляе, кіраўнікі якіх структур затрыманыя разам з кіраўніком «Белнафтахіму» Аляксандрам Бароўскім 29 мая. Пра гэта БелаПАН заявіў начальнік Цэнтру інфармацыі і грамадзкіх сувязей КДБ Валер Надтачаеў.

Абвінавачаньне затрыманым павінна быць прад'яўлена на працягу 10 дзён. У асобных выпадках гэты тэрмін можа быць і падоўжаны.

А.Бароўскі ўзначаліў «Белнафтахім» у сьнежні 2005 году. На гэтую пасаду ён прыйшоў з дырэктарства ў навапалацкім «Паліміры», а да таго працаваў у Бабруйску на «Белшыне».

«Беларускі партызан» паведамляе, што разам з Бароўскім затрыманыя некаторыя ягоныя намесьнікі. «Беларускі партызан» называе Бароўскага чалавекам старшыні палаты прадстаўнікоў Канаплёва і расцэньвае затрыманьне вялікім ударам па бізнэс-групе Канаплёва. Зь ёю, у прыватнасьці, цесна зьвязаныя буйныя бізнэсоўцы Юры Чыж і Аляксей Ваганаў.

**Мікола Бугай**

# Чатыры хвіліны на закон аб ільготах

28 мая савет рэспублікі адзінагалосна ўхваліў законапраект «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян», прыняты палатай прадстаўнікоў 23 траўня.

Закон уступіць у сілу 1 студзеня 2008 году.

У часе прыняцьця парлямэнтары не задалі дэпутату-дакладчыку ніводнага пытаньня, як і прысутнаму ў залі пасяджэньняў міністру працы і сацыяльнай абароны Ўладзіміру Патупчыку. Працэдура прыняцьця закону заняла чатыры хвіліны.

Скасаваньне льготаў паказвае, што ўлады ацэньваюць эканамічную сытуацыю ў сярэднетэрміновай пэрспэктыве як стабільную і таму не баяцца росту сацыяльнай напружанасьці.

## Лукашэнка: Бясплатны праезд — гэта глупства

У часе паездкі ў Берасьце кіраўнік дзяржавы выступіў у падтрымку законапраекту аб адмене льготаў. «Калі мы хочам у сярэдзіне жыцьця сыходзіць на пэнсію ды яшчэ і льготы атрымліваць, то гэта немагчыма. Навошта, напрыклад, студэнту, які жыве ў Берасьці, бясплатны праезд? Гэта глупства, — сказаў ён. — Па горадзе трэба пешкі хадзіць. А калі хочаш езьдзіць — плаці, такая рэальнасьць, мы жывём у рынкавай эканоміцы».

Закон «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорыяў грамадзянаў» прадугледжвае захаваньне асноўных ільготаў, гарантыяў і перавагаў для:

— ўдзельнікаў вайны і прыроўненых да іх асобаў;

— бацькоў загінулых (памерлых) у часе выкананьня службовых абавязкаў вайскоўцаў;

— інвалідаў 1-й і 2-й групаў;

— інвалідаў ЧАЭС; непаўналетніх дзяцей, што пражываюць у зонах радыеактыўнага забруджваньня.

Закон адмяняе наступныя льготы і гарантыі:

— зьмяняюцца ўмовы і парадак прадстаўленьня санаторна-курортнага лекаваньня;

— абмяжоўваюцца правы на вайскоўцаў і міліцыянтаў (бясплатнае атрыманьне лекавых сродкаў, бясплатны праезд на адпачынак)

— скасоўваюцца льготы для былых вязьняў канцлягераў,

— адмяняецца зьніжка з кошту праезду на пасажырскім транспарце для навучэнцаў і студэнтаў, вэтэранаў працы, грамадзянаў у часе выкананьня службовых абавязкаў;

— абмяжоўваецца колькасьць асобаў, якім прадстаўляюцца льготы па аплаце жыльлёва-камунальных, мэдычных паслугаў, паслугаў сувязі;

Ільготы па аплаце паслугаў ЖКГ захаваюцца для непрацуючых пэнсіянэраў зь ліку вайскоўцаў, міліцыянтаў, а таксама інвалідаў ЧАЭС і тых інвалідаў 1-й і 2-й групаў, што ня маюць працаздольных членаў сям'і.

Правы на бясплатнае атрыманьне лекавых сродкаў і 50%-ю зьніжку пры аплаце кошту паслугаў ЖКГ распаўсюджваецца толькі на бацькоў вайскоўцаў, партызанаў і падпольшчыкаў, што загінулі (памерлі) у часе выкананьня вайсковага і службовага абавязку.

## КАЛІ Б...

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА




**...Ён сам прытрымліваўся сваёй устаноўкі — па горадзе хадзіць пехам.**

# Маладафронтаўцы застануцца на свабодзе

Улады адкручваюць гайкі напярэдадні рашэньня Эўрасаюзу па гандлёвых прэфэрэнцыях.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Зьміцер Хведарук (справа), Наста Палажанка і Барыс Гарэцкі ідуць у суд.**

З раніцы ля суду Савецкага раёну сталіцы, што на Лагойскім тракце, дзяжурылі людзі ў цывільным з рацыямі. Яны нікога не пускалі да будынку, дзе а 10-й павінен быў пачацца суд. Калі Зьміцер Хведарук запатрабаваў, каб людзі ў цывільным паказалі дакумэнты, адзін зь іх прадэманстраваў пасьведчаньне байца ПМСН. Пасьля паўгадзіны спрэчак міліцыянты дазволілі прайсьці ў залю родным, прадстаўнікам дыпмісіяў, палітыкам і журналістам. У суд трапілі Аляксандар Мілінкевіч, Іна Кулей, Станіслаў Шушкевіч, Валер Шчукін, Оке Пэтэрсан, Карэн Ст'юарт, Гары Паганяйла.

Зьміцер Хведарук, Алег Корбан, Наста Палажанка і Барыс Гарэцкі ў 10.40 занялі месца на лаве падсудных. Праз дзесяць хвілін судзьдзя Руслан Аніскевіч пачаў працэс.

У гэты ж момант пад вокнамі моладзь пачала скандаваць «Свабоду палітвязьням», «Жыве Беларусь!», «Ганьба», «Моладзь за Беларусь», «За свабоду». Галасы былі добра чуваць у залі. Гэта нэрвавала судзьдзю і дзяржабвінаваўцу. Сп.Аніскевіч нават зазначыў: «Я прашу захоўваць цішыню, ці вам недастаткова размоваў, якія вядуцца на вуліцы?» Людзі пад вокнамі сьпявалі «Магутны Божа», «Паветраны шар», «Тры чарапахі».

Павал Севярынец пералічыў прысутных каля суду: было 372 чалавекі.

Напачатку судзьдзя запытаўся: «Я ведаю, што ўсе вы паслугоўваецеся беларускай мовай. Ці патрэбен вам перакладчык?» Усе, апроч Гарэцкага, запатрабавалі перакладчыка. Судзьдзя паставіў пытаньне: ці магчымы разгляд справы Аляксея Янушэўскага безь яго прысутнасьці ў залі? Адказ быў станоўчы.

Пачалі браць паказаньні. Пракурора Міхонскую цікавіла, ці бралі яны ўдзел у сходах МФ, ці трэба заява, каб уступіць у арганізацыю, якія мэты ў МФ, колькі сяброў, хто кіраўнік, хто за што адказвае, ці ёсьць складкі, ці ведалі, што арганізацыя незарэгістраваная. На большасьць пытаньняў абвінавачаныя адказваць адмаўляліся.

Абвінавачваньне грунтавалася на канфіскаваных падчас ператрусаў на кватэрах маладафронтаўцаў друкаваных матэрыялах, на раздрукоўках тэлефонных размоваў і аўдыёзапісе сходаў 29 верасьня 2006 г., 25, 29 студзеня, 1, 4 лютага 2007 г. З.Хведарука вінавацілі ў тым, што ён кіраваў Першамайскай радай МФ, А.Корбана — Партызанскай, А.Янушэўскага — Заводзкай. Б.Гарэцкага — у тым, што быў прэс-сакратаром арганізацыі, Насту Палажанку — што ачольвала арганізацыйны аддзел МФ.

Мэтай дзейнасьці МФ, на думку абвінавачваньня, ёсьць захоп улады шляхам масавых вулічных акцыяў.

А.Корбан заявіў, што ён ужо не зьяўляецца сябрам арганізацыі — калі ўступіў у сілу артыкул 193, ён напісаў заяву аб выхадзе з МФ і цяпер зьяўляецца старшынём Партызанскай рады АГП.

На суд зьявілася сямёра зь 19 выкліканых сьведкаў. Авацыі сарваў 13-гадовы Мікіта Броўка, які адразу адмовіўся даваць паказаньні.

Пасьля па хадайніцтве Хведарука, суд абвесьціў перапынак на абед. На ганку выступіў А.Мілінкевіч, які сказаў, што ў знак салідарнасьці ўступае ў «Малады фронт» і заклікаў усіх зрабіць тое ж.

Пасьля перапынку судзьдзя прызнаў, што разгляд аўдыёзапісаў сходаў немагчымы, бо на іх не было адпаведных санкцый і экспэртызы. Адвакаты адразу ж падалі хадайніцтва аб спыненьні справы, аднак судзьдзя сказаў, што пакуль немагчыма разглядаць гэтае хадайніцтва.

Былі зачытаныя паказаньні трох сьведкаў, якія не змаглі зьявіцца. У тым ліку сьведчаньні былога намесьніка П.Севярынца Сержука Лісічонка, які піша, што «сышоў з МФ, бо не хацеў больш



**Пракурор Міхонская.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

займацца фантомнымі глупствамі». Пачаліся судовыя спрэчкі. Адвакаты настойвалі, каб яны праходзілі заўтра, але судзьдзя адхіліў прапанову. Падалося, што ён хоча скончыць суд за дзень.

Урэшце пракурор — у сувязі з тым, што «Малады фронт» не ўяўляе сабой вялікай небясьпекі грамадзтву» — запатрабавала… — усе замёрлі — аштрафаваць Хведарука, Гарэцкага, Янушэўскага і Корбана на 500 базавых велічынь (7 200 даляраў)… Уздых палёгкі й радасьці прабег па залі. …Для Насты Палажанкі як непаўнагадовай яна запатрабавала выкарыстаць «прымусовыя меры выхаваўчага характару».

У апошнім слове З.Хведарук сказаў, што да справы «Маладога фронту» прыкаваная цікавасьць усяго сьвету, і заклікаў судзьдзю яшчэ раз падумаць перад тым, як выносіць прысуд. У справе быў абвешчаны перапынак.

Аўторак, 15.00. Судзьдзя прызнаў сябраў МФ вінаватымі ў парушэньні арт. 193 КК «Дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі».

Зьміцер Хведарук атрымаў 40 базавых велічынь штрафу (1 млн 240 тыс.), Алег Корбан, Аляксей Янушэўскі, Барыс Гарэцкі — па 30 б.в. кожны (930 тыс.), Насьце Палажанцы вынесена перасьцярога. Сыстэмныя блёкі і вінчэстары канфіскаваныя ў даход дзяржавы.

На судовым ганку маладафронтаўцаў віталі дзьве сотні жыхароў сталіцы з воклічамі «Жыве Беларусь!», з кветкамі і балёнікамі. Адкаркавалі шампанскае. Дарэчы, якраз у аўторак Аляксею Янушэўскаму, які ў часе суду быў у Чэхіі, споўнілася 20 гадоў.

**Зьміцер Панкавец**

# Кангрэс па сцэнары Калякіна

Дэмакратычныя сілы перайшлі да калектыўнага кіраўніцтва. Кангрэс дэмакратычных сілаў скончыўся прыняцьцем памяркоўнае стратэгіі, якая прадугледжвае элемэнты супрацоўніцтва з уладамі і ня ставіць задачай далучэньне да Эўрасаюзу. Сустаршынямі Палітычнай рады Аб'яднаных дэмакратычных сілаў сталі Вінцук Вячорка, Сяргей Калякін, Анатоль Лябедзька, Анатоль Ляўковіч. Нязгодны з прынятай стратэгіяй, Аляксандар Мілінкевіч ад пазыцыі сустаршыні адмовіўся. Рэпартаж **Зьмітра Панкаўца**.

Субота, 26 траўня. Праца Кангрэсу пачалася з гімну. Усталі ўсе. Праўда, як пазьней высьветлілася, большасьць ня ведала, што за музыка грае. Тлумачэньні Станіслава Шушкевіча пра тое, што гэтую старажытную кампазыцыю некалі знайшоў Віктар Скарабагатаў, былі не самымі пераканаўчымі. Заставалася гадаць, ці то «Полацкі сшытак», ці нешта яшчэ.

З уступным словам выступіў старшыня аргкамітэту Аляксандар Бухвостаў. Выступаў на вельмі кепскай беларускай мове. Бухвостаў падвёў вынікі Кангрэсу двухгадовай даўніны, ён адзначыў, што важна захаваць адзінства апазыцыі, а для гэтага трэба прыняць агульную стратэгію дзеяньня. З раніцы на ўдзел у Кангрэсе было зарэгістравана 568 дэлегатаў, пасьля абеду колькасьць узрасла яшчэ дзесьці на сто чалавек. Гэтага хапіла для кворуму.

Першую частку Кангрэсу пачалі весьці Валер Ухналёў і Валянціна Сьвяцкая. Першым слова папрасіў толькі вызвалены з «хіміі» Мікола Статкевіч. Ён сказаў: «Дайце мне тры хвіліны. Думаю, гэта ня так шмат пасьля двух гадоў». Статкевіч заклікаў першым пунктам праграмы разгледзець стратэгію апазыцыі. Плянавалася, што галасаваньне за стратэгію пройдзе назаўтра, але Статкевіч настойваў на сваёй прапанове.

Сьледам за ім слова ўзяў яшчэ адзін нядаўні палітвязень Павал Севярынец. Ён цалкам падтрымаў пазыцыю Статкевіча. Трэба вызначыцца, ці мы зьбіраемся перамагаць пад бел-чырвона-белымі сьцягамі, ці бязь іх, каб не злаваць камуністаў, сказаў ён. Пасьля гэтых выступаў у залі пачаліся скандаваньні «Жыве Беларусь», зьявіліся бел-чырвона-белыя сьцягі. Заля была надзвычай узрушаная пасьля такіх прамоваў.

Каб адказаць Севярынцу і Статкевічу, слова ўзяў камуніст з Талачына палкоўнік Мікалай Петрушэнка. Ужо пасьля некалькіх словаў заля загукала «Ганьба». Абражаны выступоўца, які пачаў быў гаварыць па-беларуску, перайшоў на расейскую. Словы прафэсара Хадыкі таксама былі сустрэтыя «Ганьбамі».

Стала відавочна, што Ўхналёў, які нэрваваўся, не кантраляваў сытуацыю ў залі. Тады Станіслаў Шушкевіч вызваўся ўзяць кіраўніцтва сходам на сябе. Людзі яго падтрымалі, і Шушкевіч здолеў навесьці парадак у залі.

Сяргей Скрабец заклікаў дэлегатаў Кангрэсу прыняць два рашэньні: прызнаць цалкам нелегітымнай уладу Лукашэнкі; сфармаваць урад народнага даверу, якому можна было б перадаць усе паўнамоцтвы. Прапановы Скрабца таксама паабяцалі разгледзець.

А.Мілінкевіч у сваім выступе адзначыў, што леташняя прэзыдэнцкая кампанія была найлепшай кампаніяй апазыцыі за апошнія гады, што яна здолела даць людзям надзею, заглушыць іх страх. Кампанія не была прайграная, адзначыў А. Мілінкевіч, бо не было спаборніцтва. Мілінкевіч адзначыў, што сёньня трэба стратэгія дзейснай барацьбы, а не яе імітацыі, і падтрымаў стратэгію «Эўракааліцыі». Таксама ён падкрэсьліў, што апазыцыя перажывае глыбокі крызіс, выкліканы ўнутраным змаганьнем за ўладу. «Для тых, хто мне давярае, я гатовы заставацца адзіным лідэрам апазыцыі», — адзначыў ён. Мілінкевіч яшчэ раз пацьвердзіў, што не зьбіраецца вылучацца ў сустаршыні.

Сяргей Калякін пагадзіўся з Мілінкевічам у ацэнцы выбараў 2006 г., таксама адзначыў, што ня бачыць прынцыповай розьніцы між стратэгіяй «Эўракааліцыі» і стратэгіяй аб'яднанай апазыцыі: і там, і там вядзецца пра канстытуцыйную зьмену ўлады. Лідэр камуністаў адзначыў, што ўлада пойдзе на перамовы толькі з моцнай апазыцыяй, і заклікаў да кансалідацыі.

Пасьля абеду жарсьці ў залі відавочна супакоіліся. Быў заслуханы тэлезварот ад амэрыканскага Кангрэсмэна Джона Шымкуса, а таксама зачытаныя лісты падтрымкі ад эўрапейскіх палітычных структураў.

Першым у другой палове дня выступаў лідэр АГП Анатоль Лябедзька. Ён сказаў, што калі б Лукашэнка глядзеў гэты Кангрэс у жывым эфіры, то ён бы задаволена паціраў рукі. Лябедзька сказаў, што таксама гатовы адмовіцца ад пасады сустаршыні, але тэрмінова неабходна вызначыцца, хто ў апазыцыі будзе адказваць за якую дзейнасьць. Лябедзька сказаў, што таксама хацеў бы, каб у апазыцыі быў ярка выражаны лідэр, але яго пакуль няма.

Вінцук Вячорка ў сваёй прамове засяродзіўся на міжнародным прызнаньні дзейнасьці беларускай апазыцыі.

Станіслаў Шушкевіч прапанаваў паставіць на галасаваньне альтэрнатыву. Першы бюлетэнь — за абраньне сустаршынямі палітычнай рады аб'ядных дэмакратычных сіл (АДС) мусяць быць Вячорка, Калякін, Ляўковіч і Лябедзька. Другі бюлетэнь — старшынём палітрады АДС мусіць быць Мілінкевіч.

Вельмі эмацыйным аказаўся выступ Людмілы Гразновай, якая пераконвала, што ў апазыцыі мусіць быць адзіны лідэр. «Апазыцыя ня можа быць абезгалоўленай», — сказала яна. Унутрыкааліцыйныя разборкі яна зьвязвае з умяшальніцтвам Расеі, «якая адчувае хуткія зьмены ў Беларусі і ня хоча, каб яны адбыліся».

Праца Кангрэсу скончылася а 19:00. Паўлу Севярынцу і Міколу Статкевічу так і не ўдалося павярнуць Кангрэс з заплянаванага ходу. Такім чынам, вырашальным меўся стаць заўтрашні дзень. Павал Севярынец казаў у першы дзень кангрэсу, што сілы прыхільнікаў дзьвюх стратэгіяў падзеленыя амаль пароўну. Вырашальнымі мусілі быць галасы тых, хто пакуль




ня вызначыўся ў сваёй пазыцыі.

Нядзеля, 27 траўня. Віною таму праліўны дождж, які з раніцы прайшоў над Менскам, ці што іншае, але жарсьці ў нядзелю былі непараўнальна меншымі, чым у першы дзень Кангрэсу.

А 9:00 прайшла прэс-канфэрэнцыя кіраўнікоў фракцыяў, сфармаваных у першы дзень Кангрэсу. Як высьветлілася, найбольшай стала фракцыя «Рэгіёны за свабоду», у якую ўвайшоў 201 чалавек. Агулам было сфармавана 8 фракцыяў. Кіраўнікі фракцыяў АГП і БНФ заявілі, што на наступных соймах будзе разгледжанае пытаньне аб выключэньні сяброў партыі, якія ўвайшлі ў «Рэгіёны за свабоду», бо гэта супярэчыць статуту дадзеных партыяў.

Пасьля гэтай канфэрэнцыі пачалася ўласна праца Кангрэсу. Першым слова папрасіў народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. У сваёй прамове Ніл Сымонавіч адзначыў, што шлях да лідэрства не перакрыты ні для кога, галоўнае — годна працаваць. Гілевіч сказаў, што ўжо сёньня, на ягоную думку, лідэрскімі здольнасьцямі валодае Павал Севярынец. Могуць да статусу лідэра дарасьці і некаторыя іншыя маладыя палітыкі. «Лідэр — гэта ня Папа Рымскі», — сказаў Гілевіч. Словам паэта заля пляскала стоячы.

Пасьля слова ўзялі кіраўнікі фракцыяў. Нічога істотна новага яны не сказалі, амаль усё гэта прагучала яшчэ ў суботу, кожны заставаўся на сваёй пазыцыі. Таксама трымалі слова Аляксандар Валчанін (ад чарнобыльскіх ліквідатараў), Анатоль Ляўковіч (БСДП) і прадпрымальнік з Барысава Віктар Гарбачоў. Гэты сказаў, што «апазыцыя мае шмат правадыроў, але мала індзейцаў». На гэтым першая частка другога дня скончылася.

Адразу пасьля перапынку слова ўзяў «маладафронтавец» Зьміцер Хведарук, які зачытаў прывітальны ліст да ўдзельнікаў Кангрэсу ад Артура Фінькевіча. Палітвязень рашуча падтрымаў у сваім звароце стратэгію «Эўрапейскай кааліцыі». Фінькевіч адзначыў, што спадзяваньні на эвалюцыю рэжыму — гэта абсалютная ўтопія.

У чарговым сваім выступе Павал Севярынец заявіў, што стратэгія Аб’яднаных дэмакратычных сілаў— гэта стратэгія чаканьня. Ён выступае за актыўныя выступы супраць рэжыму, перацягваньне на свой бок тых грамадзянаў, хто крытыкуе рэжым, але не набраўся моцы, каб выступіць. Адзін Севярынец успомніў, што другі дзень Кангрэсу прыпадае на хрысьціянскае сьвята Тройцу, і павіншаваў усіх прысутных.

Генэрал Фралоў быў шматслоўным, большасьць ягоных заўвагаў практычна ніяк ня тычылася працы Кангрэсу. Пасьля таго як Аляксандар Дабравольскі сказаў, што час ужо скончаны, і, як былы вайсковец, Фралоў мусіць паказаць прыклад іншым, генэрал адзначыў: «Я ўжо не вайсковец, я вышэй — я дэмакрат». Урэшце, Валер Фралоў заклікаў усіх прагаласаваць за стратэгію, прынятую Палітрадай.

Рэгіянальны актывіст з Горак Эдуард Брокараў адзначыў, што Кангрэс абсалютна нічога не вырашае. «Усе будуць рабіць тое, што рабілі дагэтуль»,— сказаў Брокараў. Жанна Літвіна ў сваім выступе засяродзілася на праблемах незалежных СМІ.

Напрыканцы яшчэ раз слова атрымаў Аляксандар Мілінкевіч. Ён адзначыў, што нельга яднацца толькі супраць аднаго канкрэтнага чалавека. «Трэба яднацца на грунце наступных каштоўнасьцяў: дэмакратыя, незалежнасьць і інтэграцыя ў Эўропу». Сп. Мілінкевіч яшчэ

**Працяг на старонцы 8.**

# Кангрэс па сцэнары Калякіна

Працяг са старонкі 7.

раз адзначыў, што ня верыць у дзейснасьць той стратэгіі, якая выносіцца на разгляд Кангрэсу, таму адмаўляецца ад сустаршыньства ў кааліцыі.

Старшыня мандатнай камісіі спн.Ваніна абвесьціла, што ў залі магчымыя фальсыфікацыі зь дэлегацкімі мандатамі, і прапанавала ўсім прайсьці перарэгістрацыю. Канчатковая лічба ўдзельнікаў Кангрэсу склала 611 чалавек, ці дзьве траціны ад колькасьці абраных дэлегатаў.

Ужо пасьля перапынку, зьвязанага зь перарэгістрацыяй, на сцэну вырываўся прадпрымальнік зь Віцебску Сяргей Парсюкевіч, якога стрымлівала ахова. Урэшце, яму далі слова. Парсюкевіч сказаў, што нягледзячы на любое рашэньне Кангрэсу, кансалідацыя між усімі апазыцыйнымі сіламі ўжо немагчымая, і гэта абсалютна відавочна.

Адразу па гэтым выступе пачалося галасаваньне. Эканамічная плятформа і Малая канстытуцыя былі падтрыманыя дэлегатамі практычна аднагалосна. Ніякіх пытаньняў ня выклікала і прыняцьце звароту да беларускага народу і міжнароднай супольнасьці.

Самым напружаным момантам другога дня Кангрэсу стала галасаваньне за стратэгію дзеяньня апазыцыі. Апроч агульнай стратэгіі Палітрады і «Эўрапейскай кааліцыі», сваю стратэгію прапанавала і Партыя БНФ, але ў хуткім часе зьняла яе з разгляду. Стратэгію «Эўрапейскай кааліцыі» таксама не разглядалі — рэдакцыйная камісія вырашыла, што стратэгія, прынятая Палітрадай, цалкам закрывае стратэгію Статкевіча.

Першае галасаваньне адносна стратэгіі скончылася канфузам, бо агулам «за» і «супраць» прагаласавала больш дэлегатаў, чым было зарэгістравана. Станіслаў Шушкевіч прапанаваў правесьці тайнае галасаваньне, але ягонай прапановы не паслухаліся.

Другая спроба дала наступныя вынікі: «за» стратэгію АДС прагаласавала 365 дэлегатаў, «супраць» — 185. Адразу па абвяшчэньні вынікаў большасьць дэлегатаў, якія галасавалі «супраць», пакінулі залю.

Яшчэ былі разгарэліся спрэчкі адносна таго, ці варта ўключаць у склад Палітрады адразу дзьве прадпрымальніцкія арганізацыі, але яны мала тычыліся непасрэдна працы Кангрэсу.

На першым паседжаньні Палітрады было вырашана, што сустаршынямі Палітычнай рады стануць старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка, старшыня ПКБ Сяргей Калякін, старшыня АГП Анатоль Лябедзька і в.а. старшыні БСДП Анатоль Ляўковіч.

Мілінкевіч жа ў сваю чаргу адзначыў, што надалей зьбіраецца засяродзіцца на працы з рухам «За Свабоду». Таксама ён сказаў, што зьбіраецца балятавацца ў прэзыдэнты на наступных выбарах.

На Кангрэсе'2007 супярэчнасьці ў шэрагах апазыцыі выплеснуліся, але ня вырашыліся. Калектыўнае кіраўніцтва звычайна практыкуецца на пераходных этапах, і можна чакаць працяглае барацьбы за ўплыў між групоўкамі кансэрватараў, нацыянал-дэмакратаў, лібэралаў, сацыял-дэмакратаў і камуністаў.

# Апазыцыя падзялілася на рускіх і нярускіх

Кангрэс–2007 быў увэрцюрай да змаганьня за пасаду кандыдата–2010.

Кангрэс Аб'яднаных дэмакратычных сілаў замацаваў падзел у апазыцыі. На першы погляд, гэты раскол выкліканы чыста амбіцыямі лідэраў. У глыбіні рэчаў за ім стаіць канфлікт культураў.

Кідалася ў вочы на тое, як асьцервянела перад Кангрэсам і на ім імкнуліся здыскрэдытаваць Мілінкевіча прарасейскія публіцысты. Справа тут не ў асабістай непрыязі і тым больш не ў імкненьні знайсьці мацнейшага лідэра. Аслабіць Мілінкевіча значыла для іх падарваць эўрапейскі выбар апазыцыі.

Аднак адкрыта прарасейскія сілы, ня маючы людзкой базы, ніколі не пачнуць дамінаваць у апазыцыі.

Нашмат мацнейшымі застаюцца дзьве найбуйнейшыя плыні. У 2001 годзе адну зь іх рэпрэзэнтаваў Домаш (і Мілінкевіч быў начальнікам ягонага штабу), другую — Ганчарык (і Калякін быў часткаю розыгрышу, які яго вызначыў адзіным). У 2006-м Мілінкевічу ўдалося пашырыць сваю кааліцыю, аднак другая плынь спарадзіла Казуліна.

Абодва кірункі разнародныя і ў прыхільнасьцях да першага і другога сапраўды нямала асабістага. Усё ж, у цэлым, першы — хутчэй правацэнтрысцкі і нацыянальны. Другі — пераважна левацэнтрысцкі, з сувязямі ў Расеі, з каранямі ў намэнклятуры. Тыя і другія аднолькава маюць вочы на Захад, аднак беларускасьць адных і рускасьць другіх стварае культурны бар'ер і выклікае ўзаемны недавер.

Балянсам паміж дзьвюма плынямі цяпер сталі АГП, БНФ і нацыянальна настроеныя актывісты сацыял-дэмакраты. Па сваёй беларускасьці яны бліжэйшыя да «Руху за свабоду», але іхныя лідэры ня бачаць сабе побач зь Мілінкевічам месца і баяцца рэбрэндынгу, які дазволіў бы пакінуць у мінулым аджылыя брэнды, але часова панізіў бы статус некаторых лідэраў. Думаю, гэтыя яшчэ павандруюць з кааліцыі ў кааліцыю. А можа, павядуць уласную гульню ў ролі цэнтрыстаў.

Да 2010 году (у адпаведнасьці з Канстытуцыяй выбары павінны адбыцца пры канцы 2010 году) многае зьменіцца. Заўважыўшы ўзмацненьне Калякіна, улады могуць выпусьціць Казуліна. Свае сілы ў прэзыдэнцкай гонцы яшчэ ніколі не спрабаваў Статкевіч. А вось Севярынцу ў 2010-м яшчэ ня споўніцца 35-ці, патрэбных для кандыдаваньня. У любым разе, Кангрэс-2007 быў толькі першым крокам складанай кулуарнай гульні, у якой пераможа той, хто будзе здольны яднаць вакол сябе і рабіць неардынарныя крокі.

**Барыс Тумар**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Бюракраты баяцца герояў

Кідаецца ў вочы тое, што ўлада з прыкметнай цярпімасьцю ставіцца да партыйнай апазіцыі — пакідае ёй інстытуцыянальнае поле, магчымасьць рэгістрацыі і правядзеньня такіх вось кангрэсаў. Гэтыя самыя магчымасьці цалкам зачыненыя для грамадзкай стыхіі, якую кантраляваць цяжэй.

Згода на правядзеньне Кангрэсу дэмакратычных сілаў у сталіцы Беларусі разам з датэрміновым вызваленьнем Севярынца, Статкевіча і Садоўскай былі першымі за доўгі час відавочнымі саступкамі Лукашэнкі. Апазыцыя, занятая ўнутранымі канфліктамі, не скарысталася імі, не даўмелася зрабіць акцэнт на ўласных перамогах. Пераможцаў, вызваленых палітвязьняў, на Кангрэсе толкам не прывіталі. Бюракраты баяцца герояў.

«Я расчараваны», — сказаў пасьля Кангрэсу Алесь Мазур, камэндант намётавага мястэчка ў сакавіку 2006 году.

**Мікола Бугай**

# Бура ў шклянцы вады

Вынікі Кангрэсу дэмакратычных сілаў камэнтуе **Аляксандар Класкоўскі**.

«Кангрэс стаў падзеяй для апазыцыі, але не для грамадзтва», — сказаў мне Валер Карбалевіч.

Палітоляг ня згодны, што водападзел на Кангрэсе праходзіў, як сьцьвярджалі некаторыя палітыкі, між «левай» і «пранезалежніцкай» (або «прарасейскай» і «праэўрапейскай») плынямі. Бо ў той большасьці, што галасавала за ўхваленыя Палітрадай праекты стратэгіі, эканамічнай плятформы і «малой канстытуцыі», былі ня толькі камуністы ды казулінцы, але і прадстаўнікі БНФ, АГП. Так што, хутчэй, можна казаць пра змаганьне ў пытаньні аб кааліцыйнай герархіі.

У выніку перамагла ідэя сустаршынства (шматгаловага цмока, паводле Севярынца). «Адбылася таксама дэлегітымацыя Мілінкевіча як адзінага лідэра», — канстатуе Валер Карбалевіч. Разам з тым, на ягоную думку, цяжка сказаць, ці вырашана задача перафарматаваньня кааліцыі з мэтай падвысіць эфэктыўнасьць яе працы.

Як вядома, сам Мілінкевіч у сустаршыні не пайшоў, але ягоныя прыхільнікі ў Палітрадзе будуць. Дык ці не прадоўжыцца перацягваньне коўдры? Тым болей што Мілінкевіч на Кангрэсе казаў: адзінства — не фэтыш. Ва ўсякім разе, відавочна, што з камуністамі ягонаму руху не па дарозе.

Дарэчы, прыхільнікі Мілінкевіча складалі на мерапрыемстве каля 40%. Гэта немалая лічба. Відавочна, што рух «За свабоду!» мае патэнцыял. Іншая рэч, што, на думку асобных экспэртаў, толькі цяпер, па выніках расколу, лідэр спрабуе падвесьці пад рух ідэйны грунт у выглядзе трыяды: незалежнасьць, дэмакратыя, інтэграцыя ў Эўропу.

Шэраг назіральнікаў лічаць, што супрацьпастаўленьне «стратэгіі

Працяг на старонцы 11.

# Калгас дэмакратычных сіл

Гэта ўсяго толькі перадгісторыя. Гісторыя пачнецца праз два–тры гады, калі на даляглядзе зьявяцца выбары–2010. Піша **Пётра Рудкоўскі.**

Яшчэ калі Кангрэс-07 быў на этапе выношваньня і ніхто ня ведаў ні дня, ні нават месяца яго народзінаў, многім было ясна, што «тут справа цёмная». Цёмнай была ідэя Кангрэсу (навошта ён, якая яго мэта), цёмнай была мэтадалёгія выбару дэлегатаў (многія спэктакулярныя рашэньні адносна дэлегатаў прымаліся «наверсе» ледзь не напярэдадні зьезду), цёмнай была палітычная, геапалітычная, ідэйная арыентацыя «айцоў Кангрэсу» (інтэграцыя з Расеяй ці з Эўропай, разьлік на «эвалюцыю» Лукашэнкі ці ўсё ж імкненьне да больш радыкальных трансфармацыяў?), цёмным было таксама пытаньне, якая роля ўва ўсім гэтым расейскіх палітычных (і фінансавых) сілаў. Над Кангрэсам ад пачатку павіс цень трох змрочных дэманаў — Расколу, Інтрыгі і Акедыі. Двух першых дэманаў прадстаўляць, думаю, ня трэба, а вось пра трэцяга, які хаваецца пад мянушкай «Акедыі», пару слоў сказаць трэба. Словам «акедыя» ў старажытнасьці ўсходнія філёзафы акрэсьлівалі стан своеасаблівага духоўнага паралюшу, калі ёсьць высокая сьвядомасьць нейкага важнага абавязку і нізкая здольнасьць выканаць гэты абавязак. Чалавек тады трывае ў стане бязьдзейнасьці і сам пакутуе ад яе.

Тое, што над Кангрэсам вісеў не адзін, а цэлых тры дэманы, абцяжарвала справу тым, хто хацеў ад Кангрэсу прагрэсу. Заатакаваць адначасова трох дэманаў было цяжка, амаль немагчыма. Бо калі ты змагаесься з Расколам — рызыкуеш трапіць у абдымкі Акедыі, калі атакуеш Акедыю — ствараеш небясьпеку паглыбіць Раскол, а калі хочаш без паглыбленьня Расколу супрацьстаяць Акедыі, дык можаш неўпрыкмет ублытацца ў нейкую Інтрыгу. Вось дзе засада...

Драматургія Кангрэсу разыгралася ўсё ж паводле больш рызыкоўнага і адважнага сцэнару. На сцэну выскачылі два энэргічныя коні — Мікола Статкевіч і Павал Севярынец, — якія толькі-толькі вызваліліся ад казённых кілзаў, і з усёй моцай і рашучасьцю заатакавалі левых афіцэраў, якія тут сядзяць і плятуць няправую інтрыгу і нават правых сланоў здолелі ўцягнуць у сваё левае дзела. Левыя афіцэры перайшлі адразу ж у контратаку. Яны актывізавалі тры аргумэнты: правыя коні парушаюць рэглямэнт і тым самым выражаюць непавагу да Кангрэсу, а гэта грэх; левыя афіцэры любяць белы колер ня менш, чым чырвоны, і нават ня маюць нічога супраць іхняга спалучэньня, так што правыя коні беспадстаўна сумняваюцца



PHOTO.BYMEDIA.NET

ў іхняй любові да бел-чырвона-белай Беларусі; сярод левых афіцэраў таксама ёсьць былыя палітвязьні, так што казыраць хвалебнай мінуўшчынай Статкевічу і Севярынцу не выпадае. Вось такія аргумэнты былі актывізаваны, дарма што палымяныя маладафронтаўцы раз-пораз перарывалі выступы афіцэраў ня дужа культурным сьвістам і неадпаведнымі да сытуацыі выклікамі «Ганьба!»

Задуманага эфэкту энэргічным коням зьдзейсьніць не ўдалося, але іхні ход усё ж меў немалаважнае значэньне для «правага дзела». Севярынец і Статкевіч у нейкім сэнсе засланілі ад шаху свайго караля — Мілінкевіча. Мілінкевіч пасьля гэтых «высакаградусных» выступаў мог паўстаць як ураўнаважаная фігура і тым самым яшчэ раз пацьвердзіць сваю рэпутацыю як палітыка эўрапейскага кшталту. З гэтае нагоды ўсплыла аблуда некаторых айцоў Кангрэсу, якія ў якасьці аргумэнту супраць лідэрства Мілінкевіча называлі «ўвядзеньне падзелаў» гэтым апошнім. Узважанасьць, стрыманасьць і тактоўнасьць, якія праяўляліся ў словах і паводзінах Мілінкевіча падчас Кангрэсу (што было пад канец ацэнена і левымі афіцэрамі), наглядна паказвалі, што калі хтосьці на беларускай палітычнай сцэне і здольны яднаць, дык гэта, відаць, толькі Мілінкевіч.

Вынікам Кангрэсу — як і было задумана — сталася фармальнае пазбаўленьне Мілінкевіча лідэрства і ўсталяваньне калектыўнага лідэрства. Ясна, што з пункту гледжаньня эфэктыўнасьці дзеяньня такі тып лідэрства зусім не падыходзіць. Але ці для айцоў Кангрэсу эфэктыўнасьць наагул была прыярытэтам? Па-мойму, тактыка і стратэгія, прынятая на Кангрэсе, была прынятая пад непасрэдным уплывам згаданага вышэй дэмана Акедыі. Замучаныя адказнасьцю за лёс Бацькаўшчыны і паралізаваныя хранічнай няздольнасьцю яе ўратаваць, паважаныя кангрэсмэны абралі «стратэгію чаканьня». А чакаць можна — як Віталь Сіліцкі, здаецца, прыкмеціў — і разам, і паасобку.

Якое значэньне мае ўсё гэта для беларускага грамадзтва, для пэрспэктывы дэмакратызацыі і эўрапеізацыі? Па-мойму, ёсьць, прынамсі, адзін станоўчы вынік Кангрэсу. Кангрэс «вызваліў» Мілінкевіча, зрабіў яго больш свабодным, у пэўным сэнсе «разьвязаў яму рукі». Тое, што кангрэсмэны фармальна пазбавілі Мілінкевіча лідэрства, рэальна не паўплывае на ягоны статус як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне. Заходнія палітыкі не перастануць яго запрашаць да сябе і прыслухоўвацца да яго меркаваньня толькі па той прычыне, што некаторым афіцэрам на шахматнай дошцы беларускай палітыкі захацелася зьняць яму карону. У самой Беларусі прыхільнікаў Мілінкевіча не паменее, а, можа, іх колькасьць павялічыцца ў выніку расчараваньня бязьдзейнасьцю калектыўнага лідэра ў выглядзе квартэту з Калякіна, Вячоркі, Лябедзькі і казулінскага субстытуту Ляўковіча. Сам Мілінкевіч ужо ня будзе скаваны паліткарэктнасьцю і неабходнасьцю балянсаваць паміж такімі рознымі сіламі, як ПКБ і БНФ.

Калі хтось хоць крыху іграў у шахматы, то ведае, што кароль у шахматах — самая галоўная і адначасна самая залежная фігура. Кароль цалкам залежыць ад дзеяздольнасьці іншых фігур. Ну і што рабіць, калі гэтыя «іншыя фігуры» ня хочуць ці ня могуць быць дзеяздольнымі? Тады хіба найлепей адмовіцца ад каралеўскай годнасьці і самому стаць незалежнай дзеяздольнай фігурай. Напрыклад, ферзем. І ў выпадку Мілінкевіча такая трансфармацыя, думаю, магчымая. Перастае быць каралём, каб здалець стаць ферзем. Гэта хоць і не ідэальны варыянт, бо ідэальна было б усё ж мець адзінага караля і дзеяздольныя фігуры вакол яго, але хіба ідэальна-рэальны, ідэальны ў дадзенай рэальнасьці.

Варта памятаць, што тое, што сёньня дзеецца — гэта ўсяго толькі перадгісторыя. Гісторыя пачнецца дзесьці праз два-тры гады, калі на даляглядзе зьявяцца выбары-2010. А ад перадгісторыі ня варта патрабаваць звышарганізаванасьці. Двухгадовы пэрыяд канкурэнцыі паміж Мілінкевічам з аднаго боку і квартэтам Калякін-Вячорка-Лябедзька-Ляўковіч з другога — гэта дастатковы час, каб грамадзянская супольнасьць змагла ацаніць палітычную патэнцыю першага і патэнцыю другіх. Дзякуючы сёлетняму Расколу лягчэй будзе сканструяваць Адзінства ў 2010 годзе.

**Так што сьмялей, наперад!**

# Бура ў шклянцы вады

**Працяг са старонкі 9.**

барацьбы» і «стратэгіі чаканьня» выглядала ў пэўнай ступені штучным, нават дэмагагічным: маўляў, такім чынам хто-кольвек з палітыкаў хацеў болей выгадна пазыцыянаваць сябе на тле апанэнтаў. Вінцук Вячорка ў інтэрвію «Свабодзе» зазначыў: дыскусіі ў пытаньні стратэгіі фактычна не адбылося — адно што абмен ярлыкамі».

Наколькі маюць рацыю прыхільнікі канспіралёгіі, сцьвярджаючы, што за бясконцымі звадкамі — рука Масквы і КДБ? На думку Карбалевіча, гэтыя чыньнікі ня варта перабольшваць. Хутчэй, згубна адбіваецца шматгадовае знаходжаньне па-за сыстэмнай палітыкай. У гэтай замкнёнай прасторы міжасабовыя дачыненьні пачынаюць дамінаваць, лічыць палітоляг.

Тое, што ў пытаньнях стратэгіі не было сэнсоўнага абмену думкамі, а іншыя дакумэнты праштампавалі ўвогуле ледзь ці не аўтаматам, лішні раз сьведчыць, што канцэптуальныя рэчы апынуліся не на першым пляне. Хаця і да эканамічнай плятформы, і да «малой канстытуцыі» ў экспэртаў таксама былі сур’ёзныя пытаньні.

Варта нагадаць, што энтузіясты Кангрэсу абяцалі даць грамадзтву «пазытыўную альтэрнатыву». Але цяжка ўявіць, каб распаўсюд іхніх аб’ёмных напрацовак у масах рэзка пашырыў базу апазыцыі. Наўрад ці выклічуць вялікі рэзананс і прынятыя Кангрэсам звароты ды рэзалюцыі, сфармуляваныя цалкам у традыцыях жанру.

То бок абяцанага моцнага мэсыджу грамадзтву не атрымалася. Не разабраліся нават з супярэчнасьцямі ў сваіх шэрагах. Агульных арыентыраў, прымальнага для ўсіх альгарытму дзейнасьці не намацалі. Так, жарсьці часам аж сягалі праз край, але гэта была, на жаль, бура ў шклянцы вады.

Магчыма, найболей трапна падсумаваў вынік мерапрыемства, якое «нічога не вырашае», рэгіянальны актывіст Брокараў: «Усе будуць рабіць тое, што рабілі дагэтуль».

# Трымценьне вейкаў

Калі страчаны маральны крытэр, тады незразумела, чым апазыцыя, калі раптам яна прыйдзе да ўлады, будзе адрозьнівацца ад улады цяперашняй? Піша Віталь Тарас.

На мінулым тыдні кіраўнік дзяржавы назваў «дуратой» льготы на праезд у грамадзкім транспарце. Назваў пасьля таго, як гэтыя льготы былі скасаваныя палатай прадстаўнікоў. Яно й зразумела. Замежнае вяшчаньне на Беларусь — гэта ж таксама «ідыёцкі праект». Трэба ўсё дурноцьце вынішчаць пад корань.

А што тычыцца льготаў для дзяржаўных чыноўнікаў, дык намесьніца кіраўніка прэзыдэнцкай Адміністрацыі назвала неправамерным нават само пытаньне аб гэтым. Маўляў, усе льготы для дзяржаўных службоўцаў былі скасаваныя аднойчы і назаўсёды яшчэ ў 1994-м, адразу пасьля перамогі Лукашэнкі на выбарах. Цікава было б запытаць, за якія сродкі будуюцца дамы ў раёне сталіцы, які ў народзе празвалі ўжо «менскай Рублёўкай» (паводле аналёгіі з фэшэнэбэльным раёнам у Маскве)? Мабыць, за сэканомленыя з зарплаты грошы.

Праўда, называць раёны, кварталы або дамы «прэстыжнымі» ці «элітнымі» ад нядаўняга часу катэгарычна забаронена. Так што няма ніякіх праблемаў. У тым ліку — са шматлікімі льготамі ды прывілеямі дэпутатаў, якія дружна — 101 супраць 1-го — прагаласавалі за адмену льготаў для пэнсіянэраў, студэнтаў, былых вязьняў канцлягераў і іншых.

Адзін з дэпутатаў у абгрунтаваньне рашэньня аб пазбаўленьні некаторых людзей ільготаў на лекі заявіў, што ўсе сапраўдныя інваліды-чарнобыльцы даўно памерлі ад прамянёвай хваробы. Засталіся адны «несапраўдныя».

Цікава, ці набраўся б гэты самы дэпутат сьмеласьці паўтарыць сваю фармулёўку, калі б размова зайшла аб пазбаўленьні льготаў вэтэранаў вайны? Зрэшты, калі б далі адмашку з Адміністрацыі — чаму б і не.

### 600 раззлаваных мужчынаў

Зьдзіўляе: чаму лідэры апазыцыйных партыяў, якія ўвесь час гаварылі пра надзвычайную важнасьць праўдзівага інфармаваньня насельніцтва, гэтым разам не паклапаціліся пра тое, каб людзі дазналіся праўду — аб тым, хто і якіх ільготаў будзе пазбаўлены. Фактычна, беларускае грамадзтва было пастаўленае перад фактам галасаваньня ў палаце прадстаўнікоў. Зьдзіўляе і тое, што гэтаму пытаньню так мала надалі ўвагі камуністы і сацыял-дэмакраты (прынамсі, іх частка) — тыя самыя партыі, якія заўсёды вылучалі клопат пра абяздоленых на першы плян.

Можна, зразумела, знайсьці апраўданьне ў тым, што льготы — пытаньне прыватнае. Галоўнае — прыняць эканамічную стратэгію, а потым ужо, у яе рамках, прапаноўваць нейкія шляхі вырашэньня сацыяльных праблем.

Трэба ўзяць пад увагу й тое, што ад апазыцыі сёньня нічога не залежыць у дзяржаве. Не яна прыдумала сыстэму льготаў — не яна сёньня яе і адмяняе.

Чаго ж дбаць пра тое, што ад цябе не залежыць?

Але акрамя палітычнага аспэкту тут ёсьць і яшчэ адзін, крайне непапулярны ў партыйных масах. Што перашкодзіла лідэрам апазыцыі, ці проста шараговым дэлегатам, ясна і недвухсэнсоўна выказаць салідарнасьць з найбольш абяздоленай і неабароненай часткай беларускага грамадзтва?

Ці мае дэмапазыцыя права разьлічваць на салідарнасьць з палітвязьнямі, з ахвярамі палітычных рэпрэсіяў, калі яна не ў стане прадэманстраваць маральную салідарнасьць з інвалідамі й дзецьмі? Пра якую будучыню Беларусі ўвогуле можна весьці гаворку, калі апазыцыйных змагароў не цікавіць, што сёньня стане зь дзецьмі і інвалідамі?

Адзін з сацыял-дэмакратаў — «казулінцаў» — прапанаваў абраць Казуліна ганаровым старшынём Кангрэсу дэмсілаў. Пры ўсёй глыбокай павазе да гэтага чалавека і палітыка, які надзвычай годна й мужна паводзіць сябе ў калёніі, ягонае становішча не настолькі цяжкое й безнадзейнае, як становішча многіх інвалідаў-вазочнікаў у краіне.

Сюжэты пра калекаў калі й зьяўляюцца на экранах БТ, дык у парадку выключэньня, як нешта эпізадычнае і нетыповае. Людзі, грамадзтва ў цэлым ня любіць падобных сюжэтаў (калі толькі няшчасьце не закранула іх асабіста). Падобныя сюжэты іх раздражняюць, перашкаджаюць насалоджвацца радасьцямі жыцьця — новай машынай, паездкай на Чырвонае мора.

І ў гэтым нічога надзвычайнага няма. Так уладкаваная чалавечая псыхіка.

І пры тым, як мы ведаем зь вялікай літаратуры, чалавек, прыкуты да ложка, можа адчуваць сябе шчасьлівейшым за ўладальніка «мэрсэдэса» апошняй маркі. Толькі няшчасны ўладальнік «мэрса» чамусьці ніколі не пагодзіцца памяняцца сваім становішчам са «шчасьліўцам».

### Скафандар і матылёк

Крайнюю ступень падобнага стану паказаў у сваім фільме «Скафандар і матылёк» амэрыканскі рэжысэр Джуліян Шнабэль, які атрымаў у Кане прыз за лепшую рэжысуру. Герой стужкі ня проста прыкаваны да інваліднага вазка. Адзіны спосаб, якім ён можа трымаць кантакт з навакольнымі людзьмі — гэта трымценьне ягоных вейкаў.

Ну, зразумела, ня можа нармальны чалавек увесь час думаць пра сьмерць, хваробы ці чужыя калецтвы. Адчуўшы катарсіс ад прагляду геніяльнага фільма пра чалавечае спачуваньне ў кіназалі, ён можа пайсьці ў буфэт і добра пад'есьці. Сярод маіх знаёмых-інтэлектуалаў ёсьць і такія, якія лічаць, што пакуты чалавека, у тым ліку фізычныя — гэта яго асабістая


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Ніл Гілевіч на Кангрэсе: «Шлях да лідэрства не закрыты нікому, галоўнае — годна працаваць».**

справа. Таксама, як і ўспаміны старых людзей пра вайну, гора, змаганьне за нейкія ідэалы. Ну, было — і было. А народу гэта нецікава. Сыходзяць адны пакаленьні, прыходзяць іншыя. Яны лепшыя ўжо тым, што яны новыя. Старыя кепскія ўжо тым, што яны старыя, што яны замінаюць маладзейшым. А на былыя грамадзкія ідэалы ці калецтвы няма чаго зьвяртаць увагу. Чалавечая адзінка — нішто на тле змаганьня «масы масаў».

Што ж, і такі пункт гледжаньня, напэўна, мае права на існаваньне.

Вось толькі здаецца, што лідэр, альбо той, хто прэтэндуе на такое званьне, ня можа быць толькі часткай «масы», чымсьці ён павінен вылучацца з натоўпу. Хоць бы ў нейкі бок.

Калі «лідэры дэмсілаў» прымаюць агульныя правілы гульні, навязаныя дзяржавай, то чым іх уласныя прынцыпы і перакананьні адрозьніваюцца ад прынцыпаў тых, з кім яны змагаюцца? Няўжо толькі дэкляраваным патрыятызмам? Але ж і дзяржава ўвесь час нагадвае нам з плякатаў, што яна — «За Беларусь».

Калі страчаны маральны крытэр, тады незразумела, чым апазыцыя, калі раптам яна прыйдзе да ўлады, будзе адрозьнівацца ад улады цяперашняй? Хіба толькі прозьвішчамі новых кіраўнікоў? А ці вартыя апазыцыянэры падтрымкі грамадзтва толькі за тое, што яны абвясьцілі сябе апазыцыянэрамі?

Канечне, некаму могуць падацца сьмешнымі падобныя прэтэнзіі да ўдзельнікаў Кангрэсу. Гэта ж быў Кангрэс не філёзафаў і маралістаў, а палітыкаў. У кожнага зь якіх былі і ёсьць свае палітычныя пляны, раскладкі й меркаваньні. Кагосьці трэ было падтрымаць, кагосьці адсунуць на задні плян. Тыя групаваліся з гэтымі, іншыя тусаваліся зь іншымі. Усё нармальна. Апазыцыя чарговым разам прадэманстравала, што яна — неад'емная і арганічная частка свайго грамадзтва. У яе, як і ў грамадзтве ў цэлым, пакуль няма выразна акрэсьленай агульнай мэты, ідэі. Няма й агульных маральных прынцыпаў. Ёсьць толькі інстынкты ды інтарэсы.

І з гэтага гледзішча, магчыма, нават добра тое, што кангрэс

ня змог абраць агульнага лідэра. Бо гэта быў бы самападман, ілюзія. Нават сапраўднага расколу, аб якім шмат гаварылася напярэдадні форуму, не адбылося. Як можа раскалоцца нешта аморфнае і амаль безыдэйнае? Памнажэньне фракцыяў… Хіба на гэтым палягала мэта кангрэсу?

Ніхто зь лідэраў партыяў ня ўзяў на сябе маральную адказнасьць за тое, што адбылося (альбо наадварот, не адбылося) летась падчас прэзыдэнцкіх выбараў і пасьля іх. А бяз гэтага — хіба ёсьць сэнс гаварыць пра выбары наступныя, пра нейкую стратэгію й тактыку дэмакратычных сілаў у будучыні?

Большасьць дэлегатаў хутка разьедуцца на летнія адпачынкі. Успамін пра непрыемныя моманты кангрэсу хутка згладзіцца, саступіўшы момант новым, больш прыемным момантам, якія заўсёды прымiраюць з рэчаіснасьцю.

А інваліды ў вазках застануцца недзе там — далёка на пэрыфэрыі чалавечай сьвядомасьці.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Свабода

Свабода, як і ўсякі Божы цуд, прыходзіць неспадзявана. Свабода дае напоўніцу ўдыхнуць слодыч паветра, якое дагэтуль проста ня мела паху. І тая ж свабода абавязкова пакідае па сабе гаркавы прысмак.

Пасьля амаль двух гадоў абмежаваньня волі ўсьведамленьне, што *заўтра ў Менск*, адчуваньне пашпарта ў кішэні й шквал тэлефанаваньняў на мабільны, які нарэшце працуе, — уражаньні галавакружныя. Але разумееш: на «вялікай зямлі» чакае ўсё тое ж абмежаваньне волі, хіба што павялічанае ў маштабах, усё тое ж прыніжэньне, усё той жа *рэжым*.

Атрымаць свабоду ў пару, калі квітнеюць яблыні, вішні ды бэз, — вядома, файна. Ды бачыць, што большасьць суайчыньнікаў даўно прамяняла гэтае паветра свабоды, гэты эфірны водар на *волю* п’янак, кірмашоў ды бяздумнага забойства часу, —

**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Адбываў высылку ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны. 22 траўня выйшаў на волю. Гэтай публікацыяй аўтар завяршае рубрыку «Лісты зь лесу».

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

**24 траўня**

### Прыхільнікаў захаваньня льготаў аштрафавалі

Актывістам моладзевага дэмакратычнага руху **Яну Міхайлаву** і **Міколу Коршунаву** суд Маскоўскага раёну Менску прысудзіў штраф па 10 базавых велічыняў (310 тыс. рублёў). Маладзёнаў затрымалі спэцназаўцы 23 траўня пасьля акцыі пратэсту супраць скасаваньня льготаў на плошчы Незалежнасьці.

### Затрымалі Людмілу Атакулаву

Міліцыянты затрымалі актывістку незарэгістраванага «Маладога фронту» **Людмілу Атакулаву (на фота справа)** ў Беларускім дзяржаўным эканамічным унівэрсытэце, дзе яна вучыцца. Людміле патлумачылі, што яна зьдзейсьніла правапарушэньне і адвезьлі ў суд Савецкага раёну. Судзьдзя **Аксана Рэлява** разгледзела два адміністрацыйныя пратаколы (за «Чарнобыльскі Шлях» 26 красавіка і акцыю супраць скасаваньня льготаў 20 траўня) і пакарала яе штрафам у 25 б.в. (775 тыс. руб.).

### Узяліся за ЗБС

З раніцы семярым моладзевым актывістам тэлефанавала супрацоўніца менскай пракуратуры **Вікторыя Кухта**. Ім было прапанавана зьявіцца ў пракуратуру для размовы пра дзейнасьць студэнцкай арганізацыі **«Задзіночаньне беларускіх студэнтаў»** (ЗБС). Пры гэтым спн.Кухта не паведаміла, у якасьці каго яны запрашаюцца. Маладыя людзі вырашылі, што пойдуць у пракуратуру, толькі калі будуць мець афіцыйныя позвы.

### Абаронцаў Горадні папярэдзілі

Каля дзясятка маладзёнаў пратэставалі супраць разбурэньня будынку паравога млыну ў Горадні. Калі пратэстоўцы ўварваліся ва ўнутраны двор будынку, міліцыянты затрымалі 13




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

проста балюча.

Выходзіш у сьвет якраз напярэдадні суду над маладафронтаўцамі ды Кангрэсу, дзе трэба падтрымаць Мілінкевіча, — і адначасна разумееш, што гэта абмен на мільённыя прэфэрэнцыі.

Свабода — гэта і абдымкі новапалачанаў на ганку суду, і бел-чырвона-белыя гвазьдзікі ад хрысьціянскай пісьменьніцы Ірыны Жарнасек, і першае за два гады «вольнае» інтэрвію для Вінцэся Мудрова.

Адразу заходзіш у наваполацкую краму, каб адзначыць вызваленьне кубкам гарбаты. «Это что, водка по-польски?!.» Запаўненьне кнігі скаргаў, гістэрыка прадаўшчыцы й выкрык «фашыст!» у адказ на пажаданьне вучыць родную мову. Толькі ў чацьвёртым унівэрсаме пасьля хвіліннае паўзы — «Чаю, что ли?..» Так, смак свабоды — гэта цяпер і смак тае самае гарбаты-з-чацьвёртае-спробы.

Згадваю, як у 1993-м, у 11-й клясе, пасьля абласной алімпіяды па хіміі атрымаў у Полацкім унівэрсытэце ад рэктара запрашэньне «ганароваму хіміку» паступіць без іспытаў. Праз 14 гадоў — усё тая ж «хімія», і ў судзе ў трох кроках ад таго ж унівэрсытэту — выпісваньне «выпускнога дыплёму» «за ўзорныя паводзіны».

Свабода — гэта і блішчастыя вочы нявыспаных маладафронтаўцаў, што а чацьвёртай ранку стракаюць на менскім вакзале. Свабода — поціскі моцных рук на Варвашэні/Машэрава, 8. Свабода — рух Мілінкевіча пасьля таго, як апазыцыйная бюракратыя абірае сваёй стратэгіяй «эвалюцыю», круглыя сталы ды дамовы з рэжымам.

«Свабода! Свабода!» — шчасьлівы роў моладзі перад будынкам Савецкага суду пасьля прысуду маладафронтаўцам: безь зьняволеньня! Але разам гэта і вялізныя штрафы, і новыя допыты, і чарговыя крымінальныя справы супраць лідэра Салігорскага Маладога Фронту Івана Шылы ды Баранавіцкага МФ Яраслава Грышчэні.

Як і спрадвеку, свабода застаецца і найвялікшым дабраслаўленьнем, і найбольшым цяжарам. Воля, хараство, марнасьць марнасьцяў і тамленьне духу.

Дзякую Богу за гэтую свабоду. І за два гады ў Малым Сітне, і за маіх любых няшчасных вяскоўцаў, за 1500 лістоў ды паўтысячы наведнікаў, за клопат бацькоў і падтрымку аднадумцаў, за нашаніўскія публікацыі й тое кшталтаваньне, той гарт, якое Госпад заўсёды дае ў выпрабаваньнях.

«Павал, без Перамогі сюды не вяртайся», — казалі мне на разьвітаньне сіценцы.

Цяпер я ведаю: Малады Фронт і аб’езд беларускіх гарадоў ды мястэчак, адкуль да мяне ліставалі й прыяжджалі, і Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя, і ўдзел у руху «За Свабоду!» — усё гэта цяпер дзеля таго, каб аднойчы вярнуцца ў Сітна зь перамогай.

Тысячу гадоў таму адсюль, з Полаччыны, пачалася Беларусь, эўрапейская й хрысьціянская. Мне гэты лес, гэты лёс быў дадзены, каб нарэшце адштурхнуцца ад дна і вярнуцца да сапраўднай, поўнай і найвышэйшай *свабоды* — нацыянальнага абуджэньня.

*Менск*

Усё гэта цяпер дзеля таго, каб аднойчы вярнуцца ў Сітна зь перамогай.

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

чалавек, у тым ліку 4 непаўналетніх. Пяцёх адпусьцілі без суду. Судзьдзя **Мацяюк** аштрафаваў актывіста Партыі БНФ **Максіма Губарэвіча** на 10 б.а. (310 тыс.руб.), астатнім вынес папярэджаньні. Моладзь зьвінавацілі ў правядзеньні несанкцыяванага пікету.

### Забіты сябра Партыі БНФ

У Жлобіне на тэрыторыі складоў мясцовага прадпрыемства «Аграгандаль» знайшлі цела сябра Партыі БНФ **Аркадзя Ліскаўца**. У яго быў моцна пабіты твар і праламаны чэрап. Сп.Ліскаўцу было 53 гады. Ён быў жанаты, меў дваіх дзяцей і ўнука. Сьледчы мяркуе, што А.Ліскавец зваліўся і забіўся сам. Сябры ж лічаць, што яго маглі забіць рабаўнікі.

### 25 траўня

### Кацярына Садоўская на волі

З гомельскай жаночай турмы на волю выйшла праваабаронца **Кацярына Садоўская**, якую пакаралі двума гадамі зьняволеньня за абразу А.Лукашэнкі.

### «МФ» не зарэгістравалі

Упраўленьне юстыцыі Менгарвыканкаму адмовіла ў дзяржаўнай рэгістрацыі «Маладому фронту», спаслаўшыся на неадпаведнасьці ў Статуце. Мін’юст спаслаўся на тое, што, згодна са Статутам, пададзеным на рэгістрацыю, кіраўнічым органам руху зьяўляецца Цэнтральная рада. Тым часам 7 траўня адбывалася паседжаньне Ўстаноўчага сходу (як гэта патрабуе заканадаўства), а не Цэнтральнай рады (фармальна яшчэ ня створанай арганізацыі).

### 27 траўня

### Сьвятар на Акрэсьціна

Ноч з 27 на 28 траўня пастар **Антоні Бокун** правёў у спэцпрыёмніку-разьмеркавальніку на Акрэсьціна. Прычына затрыманьня — правядзеньне рэлігійнага сходу без дазволу уладаў. Богаслужэньне адбывалася ў прыватным доме. Пратакол быў складзены і на служыцеля царквы **Яраслава Лукасіка**, грамадзяніна Польшчы. Падтрымаць пратэстанцкага пастара прыйшлі каля 100 чалавек — вернікі эвангельскіх цэркваў Менску. Каля будынку суду знаходзіліся жонка А.Бокуна Натальля і іх пяцігадовы сын Адам.

Судзьдзя Цэнтральнага суду Менску **Леанід Ясіновіч** абавязаў пастара выплаціць штраф у памеры 20 б.а. (620 тыс. руб.).

### 29 траўня

### Памежнікаў зацікавілі паперы з Кангрэсу

Студэнта праграмы Каліноўскага **Яўгена Скрабутана** затрымалі на чыгуначным вакзале ў Горадні — памежнікаў зацікавілі паперы, якія студэнт, дэлегат Кангрэсу дэмсілаў, вёз з сабою ў Польшчу.

**СП**

# «Адмоўся ад сваёй ідэалёгіі і застанесься вучыцца»

З Акадэміі кіраваньня адлічаны студэнт—выдатнік Юрась Алейнік. Хоць сярэдні бал за чатыры курсы вучобы ў яго складае 8,4, а апошнюю сэсію ён здаў на «дзявяткі», дэкан факультэту Уладзімер Язэпчык заявіў, што такі чалавек ня можа вучыцца ў Акадэміі.

Юрась навучаўся на факультэце дзяржаўнага кіраваньня эканомікай. 16 траўня хлопца проста з распранальні пасьля валейбольнага матчу выклікалі ў дэканат, каб паведаміць, што 15 траўня яго адлічылі з Акадэміі. Афіцыйная прычына — «сыстэматычныя парушэньні вучэбнай дысцыпліны і правілаў унутранага распарадку». Выдатніка адлічылі за 22 гадзіны пропускаў у красавіку ды ігнараваньне палітычнага жыцьця ВНУ — прарэктар па выхаваўчай працы Тацяна Печанёва ўзгадала, што Юрась не галасаваў на апошніх выбарах у мясцовыя саветы. Яна не прыняла да ўвагі той факт, што Ю.Алейнік быў назіральнікам на выбарах.

Азнаёміўшы студэнта з загадам на адлічэньне, яму не прапанавалі расьпісацца ў ім, а параілі падумаць. Яго подпіс пад загадам, які б сьведчыў, што ён зь ім азнаёмлены, не стаіць дагэтуль. Хлопец меў адзіную вымову — за прагулы заняткаў. Пры гэтым запіс у юрыдычным аддзеле Акадэміі сьведчыць, што прагулы адбываліся на працягу навучальнага 2006—07 году, а ў асабістай справе — толькі ў лістападзе 2006 г.


Юрась Алейнік у дэканаце з кнігай скаргаў.

АЛЯКСАНДАР ВАСЮКОВІЧ

## Параўналі з Казуліным

Сапраўднымі прычынамі адлічэньня Юрась лічыць сваё старшынёўства ў абласной арганізацыі ТБМ, сяброўства ў БАЖ. Акрамя таго, ён арганізаваў збор паўтысячы подпісаў супраць адмены ільготаў. Досыць красамоўна гэта пацьвярджаюць такія факты. Рэктар Акадэміі Станіслаў Князеў праз свайго намесьніка Сяргея Сабалеўскага перадаў, што ня бачыць сэнсу для гутарак зь Юрасём і яго бацькамі. Калі маці хлопца зьвярнулася да дэкана У.Язэпчыка з пытаньнем, ці ўсе так добра вучацца ў Акадэміі, што вось так проста можна адлічыць пасьпяховага студэнта, пачула наступнае: «Ваш сын ня можа тут вучыцца. Больш ад мяне нічога не пачуеце». Адна выкладчыца так і параіла: адмоўся ад сваёй ідэалёгіі і застанесься вучыцца.

Тым часам, у Акадэміі няма нарматыўнай базы, якая б сьведчыла, за якую колькасьць прапушчаных гадзінаў можна адлічыць студэнта. У групе Юрася каля траціны студэнтаў за сэмэстар маюць па 22—30 гадзінаў пропускаў. Разам зь ім адлічылі студэнта, што меў запазычанасьці па ўсіх экзамэнацыйных прадметах і шматлікія пропускі.

Ужо ў чацьвер 17 траўня у падтрымку Юрася было сабрана каля 250 подпісаў студэнтаў вочнага аддзяленьня. Частка падпісантаў пад ціскам адмовілася ад сваіх подпісаў. У выніку ў рэктарат патрапіла 228 копіяў подпісаў.

Цяпер адлічанага студэнта не пускаюць у Акадэмію: ахова мае адпаведны загад. Апошні раз яго ўратавала журналісцкае пасьведчаньне. Дзеля перасоўваньня па корпусе да хлопца прыставілі «канвой» — аднаго з ахоўнікаў. Дзядзька-адстаўнік саромеўся свае ганебнае функцыі.

Праз колькі дзён пасьля адлічэньня быў праведзены спэцыяльны старастат, на якім спн.Печанёва параўнала Юрася з Казуліным.

## «Я даў ім шанец усё выправіць»

«Цэлы тыдзень я чакаў, думаў, што сытуацыя выправіцца, бо занадта шмат у гэтай справе хібаў. Але, відаць, давядзецца судзіцца», — кажа Юрась Алейнік. Бараніць інтарэсы хлопца ў судзе будзе праваабаронца Алег Гулак. У панядзелак 28 траўня ў суд будзе накіраваная скарга.

А што калі ўсё ж не адновяць? Як самую скрайнюю меру Юрась разглядае адʼезд за мяжу. Кажа, што прыкладзе ўсе намаганьні, каб давучыцца тут альбо завочна за мяжой. Пад пагрозай апынулася і другая вышэйшая адукацыя, якую ён атрымлівае ў БДУ. Ужо летам яго могуць забраць у войска. Хлопец ня супраць, але спачатку хоча атрымаць адукацыю.

**Сямён Печанко**

### Выдатнік, спартовец, толькі не камсамолец

Юрасю Алейніку 21 год. Ён вырас у Маладзэчна ў шматдзетнай сямʼі. Скончыў школу з залатым мэдалём. Навучаўся ў музычнай школе. Зьяўляецца стваральнікам і першым віцэ—прэзыдэнтам клюбу замежных моваў Акадэміі SCOFL. Удзельнік і прызёр інтэлектуальных гульняў. Захапляецца спортам: на працягу ўсёй вучобы прымаў удзел у спартовых спаборніцтвах па валейболе (член зборнай Акадэміі апошнія два гады), футболе, баскетболе, боўлінгу.

# Дзякуй

**Маўлюдзе А., Валянціне Ш., Дз. С., Ірыне Ц., Міхаілу Л., А.Б.** зь Менску.

**Аляксею С.** з Крупскага раёну.

**Міхаілу К.** з Жыткавіцкага раёну.

**Галіне Г., Б.В., Іне С.** з Барысава.

**Віктару С., Ірыне Г., Мікалаю Ў., Андрэю Т., Юр'ю П., Сяргею З., Віктару Б., Макару Ш., Эдуарду К., Мікалаю Б., Натальлі С.** з Полацку.

**Алене Г., Васілю Г., Сьцяпану Г., Н.А., Максіму Ш., А.Е., Алене Г., В.Г., Тацяне К., В.А., Аляксандру Д., Мікалаю Ш., Ірыне С., Паўлу С., Г.Ф., Зоі Д., Ігару Х., Інзе В., В.В., Уладзімеру К., Ліяне Ш., Сьвятлане Ц., Ларысе К., Вадзіму В., Міхаілу Ч., Лілії З.** зь Менскага раёну.

**Барысу М., Юрыю М., Ганьне Л., Уладзімеру А., Т.Ц., Уладзімеру К., Уладзімеру С., Уладзімеру В., І.У., У.М., Андрэю Л., Івану З.** з Жодзіна.

**Т.Л., А.І., І.А., Зьмітру М., Марыі М., А., Н.Н., Міхаілу Ж., Сяргею Я., І.Л., С.Н., С.І., А.У., А.І., А.В., Вячаславу Б., Тамары П., Л.К., Юр'ю Я., Аляксандру Л., Валер'ю П., Рэгіне Г.** з Горадні.

**А.А., В.І., Радзім Г., Н.Л., Л.В., Р.М., Вользе П., Ю.М., Васілю А.** з Магілёва.

**Генадзю С., Вользе К.** з Гарадзенскага раёну.

**Уладзімеру К.** са Смалявіч.

**Валянціне М.** з Навагрудку.

**А.А.** з Копылю.

**К., В.І., Леаніду Л.** з Маладэчна.

**Ю.У., А.Б., Уладзімеру Ш., Натальлі Р., Галіне Б., Сьвятлане Ш., Алене Д., С.Т., У.П., Л.П., Маргарыце С., М.П., А.А., У.К.** са Шаркоўшчыны.

**М.А.** з Наваполацку.

**У.Л.** з Салігорску.

**У.А.** з Мазыру.

**Мікалаю Х., Сяргею П., Максіму Н., І.В., Алегу М.** з Гомеля.

**К.С., М.С.** з Глыбоцкага раёну.

**Н.В., Н.А., І.М., Н.А.** з Клімавіч.

**Алене М., Т.П., П.У., Алене К., У.М., В.А., Уладзімеру М., Андрэю Х., С.В., Ільлі А., Натальлі Ш., Андрэю М., Эрнсту Г., Мікалаю К., А.Р., Л.І., Алісе К., Генадзю Ш., Ігару Б., Мікалаю П.** са Жлобіна.

**Вячаславу К., Галіне К., Марыі П., А.Б., Але К., Алесю С.** з Кіраўскага раёну.

**Віктару М., Леаніду Г., Сяргею Ў., Д.А., У.У., Івану Ю.** з Бабруйску.

**Вользе Г., Я.В., Валеру С., У.У., Тацьцяне Ц., А.К., Ігару Х., Алене В., Т.П., Аляксандру К., Канстанціну С.** зь Віцебску.

**Вадзіму Ш., Ірыне Л., Лілії В.** зь Берасьця.

**Віталю А., Міхаілу Т.** са Слуцку.

**Міхаілу Ў.** з Пружанскага раёну.

**Ю.А., Сяргею М., Т.А., У.А., Т.В., Аляксандру Ф., Натальлі К., Леаніду Г., Ганьне К., Галіне Ч.** з Рэчыцы

**Т.М., Л.П., Мікалаю П., Аляксандру А.** зь Пінску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перапаказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Міхась Чарняўскі: Гэта была беларуская «Маладая гвардыя»

Імені Расьціслава Лапіцкага няма ў падручніках. Але яго яшчэ помняць пад Мядзелам і ў Смургонях. Нехта чытаў антыкамуністычныя ўлёткі. Нехта чуў пра палітычны працэс і пра юнака, які выступаў на ім цэлы дзень, вінавацячы Сталіна і савецкую ўладу, а пасьля быў расстраляны. Падпольная арганізацыя Лапіцкага дзейнічала на зломе 40-х і 50-х — у страшны час выкараненьня ўсяго несавецкага. Постаці Лапіцкага прысьвяціў дзьве свае новыя кнігі **Міхась Чарняўскі**. З навукоўцам гутарыць **Зьміцер Панкавец**.



АРЦЁМ ЛЯВА

**Міхась Чарняўскі**

нарадзіўся ў 1938 у вёсцы Круці Мядзельскага раёну. Быў удзельнікам клюбу вальнадумнай інтэлігенцыі «Акадэмічны асяродак», які быў разгромлены ў 1973—74. Археоляг, спэцыяліст па першабытнай гісторыі Беларусі.

**«Наша Ніва»: Адкуль Вы дазналіся пра Лапіцкага?**

**Міхась Чарняўскі:** Удзельнікі таго падпольля былі вучнямі мядзельскай школы, дзе некалі вучыўся я. Летам 1949 году наша сям’я пераехала ў вёску Мікасецк. Зь месяц я жыў у адной вёсцы з Расьціславам Лапіцкім. У нас была істотная розьніца ў гадах, я нават ня памятаю таго хлопца. У школе бачыў малюнкі Лапіцкага — ён цудоўна маляваў. Аднакласьнікі сказалі, што гэтага хлопца расстралялі за Беларусь. Аднавяскоўцы і мой старэйшы брат шмат расказвалі пра яго і яго сяброў: што яны друкавалі антыкамуністычныя ўлёткі, зьбіралі зброю, хацелі змагацца за Радзіму. Гэта мяне так натхніла, што зімой 1951 году я сам пачаў пісаць улёткі друкаванымі літарамі, раскідваў іх па дарозе, калі ішоў у школу. Дзякуй Богу, што іх ніхто ня бачыў...

Каб не гісторыя пра Лапіцкага, я мог бы быць абсалютна іншым чалавекам. Разам з тым расказы пра Лапіцкага былі на ўзроўні фальклёру. Расказвалі, што ён быў вельмі таленавіты, зрабіў з калаўроту ровар, цудоўна маляваў, сьпяваў, граў на розных музычных інструмэнтах...

Баюся, калі б я ня ўзяўся за гэтую працу, то мог ня ўзяцца і ніхто іншы.

**«НН»: А хто быў такі Расьціслаў Лапіцкі?**

**МЧ:** Расьціслаў паходзіў са старажытнага шляхецкага роду Лапіцкіх. Бацька быў



АРЦЁМ ЛЯВА

**Расьціслаў Лапіцкі можа ляжаць недзе тут, ва ўрочышчы Красны Беражок пад Вялейкай.**



Дом Зьвяружкаў у Мядзеле, дзе зьбіраліся падпольшчыкі.

АРЦЁМ ЛЯВА

праваслаўным сьвятаром. Сям’я была шматдзетная. Абсалютна ўсе дзеці былі сьвядомымі беларускімі патрыётамі.

Лапіцкі быў арганізатарам і маторам усёй гэтай суполкі. Калі б не было яго, то справа не пайшла б далей хатніх размоваў. За Лапіцкім ішлі, моладзь круцілася каля яго, як пчолы ля вульля.

**«НН»: Калі Вы пачалі пісаць кнігі пра падпольле?**

**МЧ:** У сярэдзіне 90-х. Тым болей Арсень Ліс сказаў, што вучыўся разам з Лапіцкім у Смургонях. Пачала зьяўляцца новая інфармацыя. Размаўляў зь дзясяткамі людзей, зьвязаных з падпольлем, якія цяпер жывуць ня толькі ў Беларусі, але і ў Расеі, і ў Польшчы.

**«НН»: Ці былі людзі, якія адмаўляліся размаўляць з Вамі?**

**МЧ:** Так. Юзік Качэрга, які быў у арганізацыі ад самага пачатку, адмаўляўся дзесяць гадоў. Я тэлефанаваў яму ў Шчэцін, але Качэрга ўвесь час казаў, што хворы, альбо што нічога ня памятае. І вось я купіў бохан «Нарачанскага», зьняў з інтэрнэту здымкі мясьцінаў, дзе жыў Качэрга, азёры, дзе ён лавіў рыбу. З Варшавы, не тэлефануючы, я саджуся на цягнік да Шчэціна, прыяжджаю да Качэргі. Думаў, што ён выгане мяне. Аднак ня выгнаў. Мы размаўлялі зь ім да цемры. Ён расказаў мне тое, што ня выбілі зь яго на допытах: колькі было ўлётак, як іх распаўсюджвалі, як друкавалі, дзе былі яўкі, дзе хаваліся самі і дзе хавалі зброю. Таксама Кастусь Іваноўскі адмовіўся што-небудзь расказваць пры ўключаным дыктафоне.

Яны цяпер расказваюць ужо ўсё. Яны адкрыліся, бо адчулі, што не дарма цярпелі шмат гадоў.

## Ён сьвядома пайшоў на сьмерць

**«НН»: Раскажыце падрабязьней пра дзейнасьць арганізацыі Лапіцкага.**

**МЧ:** Мядзельска-смургонскае падполле было не беларускім і ня польскім. Яны не падымалі нацыянальнага пытаньня, бо гэта магло іх падзяліць. У іх быў толькі антыкамунізм. МГБ выйшла на падполле праз правакатара, які быў зь імі ад самага пачатку. Я не хачу казаць прозьвішча. Па справе падпольля было арыштавана дзевятнаццаць чалавек. Сам Лапіцкі быў занадта эмацыйным, а такія людзі ня ўмеюць працаваць у падпольлі. Ён спрачаўся на ўроках з камсамольцамі, не хаваючы сваіх поглядаў. Неяк

Працяг на старонцы 21.

# Героі Беларусі

Кніга Міхася Чарняўскага «Як пошуг маланкі» і ўкладзены ім зборнік успамінаў і дакумэнтаў «Ня бойцеся ахвяраў і пакут» распавядаюць пра мядзельска-смургонскае моладзевае падполле (1947—1950) і яго кіраўніка Расьціслава Лапіцкага (1928—1950). Гурток падпольшчыкаў аформіўся ў той частцы гістарычнай Віленшчыны, што адышла да БССР. Гэта быў пратэст супраць саветызацыі, гвалтоўнай калектывізацыі ды русіфікацыі заходнебеларускага грамадзтва.

«Вясной 1948 г., — піша Міхась Чарняўскі, — сярод мядзельскіх падземнікаў узьнікла ідэя разгарнуць антыкамуністычную прапаганду з дапамогай улётак. Тады гэта была найбольш эфэктыўная форма ўзьдзеяньня на людзкую сьвядомасьць».

Тэксты ўлётак пісаў кіраўнік моладзевага гуртку Расьціслаў Лапіцкі. Яны былі ляканічныя і бескампрамісныя. У адной з улётак гаварылася: «Сьмерць вырадкам роду чалавечага! Партызаны! Падпольшчыкі! Стойце на абароне сваёй справы! Беражыце ў сабе сьвятую нянавісьць да камунізму, які нявечыць і разбэшчвае чалавецтва. Біце сталінскіх шакалаў! Моладзь! (...) Да зброі! Ня бойцеся ахвяр і пакут! Уперад да сьветлай будучыні!»

У лютым 1950 г. падполле было жорстка разгромлена. 22-гадовага Расьціслава Лапіцкага расстралялі ва ўрочышчы Красны Беражок, што пад Вялейкай, астатніх 17 удзельнікаў падпольля, у асноўным школьнікаў, асудзілі да розных тэрмінаў зьняволеньня. Большасьць атрымала 25 гадоў і паражэньне ў правах.

Але перад гэтым былі жорсткія катаваньні самых гуманных сьледчых у сьвеце. «Мне зламалі дзьве рабрыны, выбілі некалькі зубоў, білі пад рэбры, пад дых, па печані і нырках. (...) Любілі катаваць буйнымі кроплямі халоднай вады на цемя. Прыцісьнуць цябе ў кут, а зьверху капае. У сьледчым пакоі было задушна, таму ад першых кропель ішоў прыемны халадок. Але пазьней адчуваньне было такое, як па галаве цяжкім молатам», — згадваў Юзаф Качэрга.

Нездарма, відаць, Міхась Чарняўскі ў прадмове да кнігі «Як пошуг маланкі» перапрашае: «Выбачаюся за тое, што сваімі роспытамі аб перажытым часам выклікаў сьлёзы і боль. Шкадую перад магіламі заўчасна памерлых, што гэтак запазьніўся з публікацыяй».

**АГ**




**Чарняўскі М. Як пошуг маланкі: Расьціслаў Лапіцкі.** — Менск: Тэхналёгія, 2006




**«Ня бойцеся ахвяраў і пакут»: Дакумэнты і матэрыялы пра дзейнасьць мядзельска-смургонскага антыкамуністычнага падзем’я (1948—1950).** / Укладальнік, аўтар біяграфій і ўступу Міхась Чарняўскі. — Вільня: «Наша будучыня», 2006

**Фільм пра Лапіцкага**

**31 траўня** (чацьвер) **на сядзібе БНФ** адбудзецца прэзэнтацыя кніжак Міхася Чарняўскага пра антыкамуністычны супраціў 40-х на Мядзельшчыне. Тамсама адбудзецца прэм’ера дакумэнтальнага фільма Валера Мазынскага пра Расьціслава Лапіцкага.

# Ад белых русаў да беларусаў

Пра Запароскую Сеч на тэрыторыі Беларусі і іншыя адкрыцьці Алега Латышонка піша Генадзь Семянчук.

Існуюць тры этымалёгіі паняцьцяў «Беларусь», «беларусы»: 1) этнаграфічна-антрапалягічна-культуралягічная; 2) палітычна-ідэалягічная; 3) загадкаванявытлумачальная. Існуе і ўяўленьне, што гэта расейцы (палякі?) накінулі нам наша ўласнае імя. Мо гэта і так, толькі дзе і кім увесь час былі носьбіты «беларускага імя»? Гэта галоўнае пытаньне, якое паставіў перад сабою Алег Латышонак, пішучы кнігу «Od Rusinów Białych do Białorusinów».

Яго тэзы зводзяцца да наступнага:

I. Паняцьце «Белая Русь» нарадзілася ў канцы XII — сярэдзіне XIII ст., у эпоху рэлігійна-культурнай і вайсковай экспансіі заходняга сьвету на ўсход Эўропы з мэтай хрышчэньня паганцаў і перахрышчваньня «схізматыкаў»-праваслаўных. Сымбалічны сэнс і значэньне назвы «Белая Русь» А.Латышонак прапануе шукаць ў сымбалях колераў каталіцкага касьцёлу, канон якіх усталяваў Папа Інакенці III (1198—1216). Белы колер сьведчыць пра апостальскі посьпех сьвятара ў місіянэрскай дзейнасьці, белы колер мог сымбалізаваць права ўладараньня Папы над усходняй царквой. Аўтар не выключае, што ў сэмантыцы назвы «белыя русы» знойдзем пераносны сэнс лацінскага слова *albus* — «сяброўскі». У вачах каталіцкіх місіянэраў тыя русы прызнавалі верхавенства Папы, у супрацьлегласьць ад русаў-«схізматыкаў». А на сярэдзіну XIII ст., калі ў геаграфічным трактаце *Descriptiones terrarium* упершыню зьяўляецца назва «Белая Русь», рэгіёнаў, населеных «белымі русамі», існавала тры: Пабужжа з цэнтрам у Драгічыне часоў Данілы Раманавіча Галіцкага, Панямоньне з цэнтрамі ў Наваградку, Ваўкавыску, Слоніме і Горадні часоў Міндоўга і, перадусім, Полаччына часоў Таўцівіла. Алег Латышонак лякалізуе «Белую Русь» на яцьвяска-літоўска-рускім памежжы. Нашыя землі ў XIII ст., вольныя ад мангольскага ярма, былі адкрытыя для каталіцкай рэлігійнай і культурнай экспансіі. Праз яе сьвет усходняга хрысьціянства, на які актыўна прэтэндавалі татары, далучаўся да Эўропы. Вось і маем першыя праявы ідэалёгіі агульнай Эўропы і першыя спробы вызначыць межы паміж Эўропай і Эўразіяй.

II. У XIII—XV ст. назвы «Белая Русь» і «белыя русы» мелі выключна літаратурна-эрудыцыйны характар і пераносіліся з твору аднаго аўтара ў іншы. Аўтар абгрунтавана піша пра вугорскія карані тэрміну «Белая Русь». А дзякуючы хроніцы Канстанцкага сабору (1414—1418), аўтарства Ульрыка Рыхенталя, імя «Белая Русь» стала вядомым па ўсёй Эўропе, праўда, без тэрытарыяльнага значэньня.

III. На думку аўтара, продкі прынялі імёны «Белая Русь», «белыя русы» як уласныя толькі ў другой палове XVI ст. пад уплывам польскай гістарычна-геаграфічнай літаратуры. Менавіта польская інтэлектуальнае асяродзьдзе XVI ст. максымальна спазнае навакольны сьвет. Гарманічнай яго часткай зьяўляюцца «беларускія» тэрыторыі. Маскоўскімі яны не маглі быць з палітычна-адміністрацыйнага гледзішча, польскімі — з культурна-рэлігійнага, украінскімі — бо стварылі адзінства, літоўскімі — бо больш разьвітыя. Паляк Ян з Стабніцы Белай Русьсю абазначае ўсе рускія землі ВКЛ і Ноўгарад Вялікі. А дзякуючы Марціну Кромеру, які выключыў зь Белай Русі Ноўгарад, Валынь, Падляшша і Кіеўшчыну, абрысы яе набылі амаль сучасныя контуры. Землі Падзьвінскія і Падняпроўскія, населеныя пераважна «рускім», «праваслаўным» людам, пасьля вызваленьня Полацку ў 1579 г. ад маскоўскай акупацыі ўсё часьцей у сьвядомасьці тубыльцаў асацыяваліся зь «Белай Русьсю». І ўжо на пачатку XVII ст. можна вызначыць яе межы ў гэтым рэгіёне: «Вярхоўе» з Полацкам, Віцебскам, Магілёвам і «панізоўскія землі» з Гомелем, Крычавам, Прапойскам. Так «Белай Русьсю» стала ўся тэрыторыя Русі XVI ст. у ВКЛ пасьля Люблінскай уніі.

IV. Эпоха Рэфармацыі. Кардынальныя перамены ў этнічна-рэлігійных стэрэатыпах у ВКЛ, рост нацыянальных пачуцьцяў. Пра прыналежнасьць да Беларусі заявілі пратэстанты. Першы акрэсьліў сябе «беларусам» кальвініст Саламон Рысінскі: 2 снежня 1586 г. ён запісаўся на навуку ў Альтдорфскі ўнівэрсытэт як *Solomo Pantherus Leucorussus*. Падобныя погляды ахоплівалі ўсё шырэйшыя колы адукаванага насельніцва ВКЛ, асабліва «беларускай» часткі. Замацаваньне сармацкай культуры ў жыцьці Рэчы Паспалітай не абмінула і ўсходнія тэрыторыі. Менавіта ў сармацкай культуры карані беларускай нацыянальнай ідэі, мяркуе А.Латышонак.

V. Усходнія палкоўнікі ў сярэдзіне XVII ст. на мяжы Казаччыны, Маскоўшчыны, ВКЛ, Польшчы зразумелі ідэалягічную патрэбу вылучацца сярод іншых. Зьяўленьне беларускай дзяржаўнай ідэі А.Латышонак зьвязвае з асобай палкоўніка Канстанціна Паклонскага, якога прапануе назваць першым, па сутнасьці, беларускім палітыкам. У сярэдзіне XVII ст. ён намагаўся стварыць на тэрыторыі Белай Русі аўтаномную дзяржаўную адзінку накшталт Запароскай Сечы. На жаль, К.Паклонскі быў самотным у сваіх памкненьнях, яго не падтрымала насельніцтва і праігнаравала шляхта.

VI. У XVIII ст. «Беларусь, беларускі» — пашыраны палітыка-адміністрацыйна-культурны назоў: «беларускія войскі», «беларускія адміністрацыйныя і канфэсійныя адзінкі». А.Латышонак мае рацыю: расейцы ў акупацыйнай палітыцы выкарысталі мэнтальна-ідэалягічную сытуацыю доўгачасовага (ад сярэдзіны XVII ст.) існаваньня «беларускасьці» на землях, далучаных да Расейскай імпэрыі ў 1772 г. Аднак беларуская сьвядомасьць у катэгорыях нацыянальнай самаідэнтыфікацыі яшчэ не сфармавалася ў той час. Гэта было адкладзена на XIX ст.

VII. Сучасны беларускі народ сфармаваўся як з праваслаўных нашчадкаў русаў, так і каталіцкіх нашчадкаў ліцьвінаў. Таму падзел на праваслаўных і каталікоў быў адной з галоўных перашкод у стварэньні мадэрнага народу. Падвалінамі беларускай нацыянальнай




**Oleg Łatyszonak. Od rusinów białych do białorusinów (u źrydeł białoruskiej idei narodowej). – Białystok 2006.**

ідэі зьяўляюцца агульная мова, культура і агульная гісторыя, якая пачынае канструявацца з другой паловы XIX ст. Якраз фармаваньне супольнай гістарычнай візіі ў новы час было самым цяжкім. На думку А.Латышонка, у адрозьненьне ад ліцьвінаў і каронных русаў (украінцаў), беларускае насельніцтва ВКЛ ня мела тады моцнай гістарычнай традыцыі. Для ліцьвінаў — гэта віленская традыцыя, для украінцаў — кіеўская. Для беларусаў лягічнаю была б полацкая з выбранымі фрагмэнтамі віленскай і кіеўскай. Аднак ужо на пачатку XVI ст. ліцьвіны напісалі ўласную гісторыю ВКЛ, вынішчаючы зь яе ўсялякія ўзгадкі пра полацкую дзяржаўнасьць. Літоўскую вэрсію гісторыі беларускіх земляў спапулярызаваў Мацей Стрыйкоўскі ў сваёй «Хроніцы», якая доўгі час была адзінай крыніцай гістарычных ведаў і для русінаў ВКЛ. Пададзеныя вышэй разважаньні прыводзяць А.Латышонка да канстатацыі: галоўнай прычынай, чаму беларускі народ не сфармаваўся ў найноўшы час, была не слабая нацыянальная сьвядомасьць насельніцтва Беларусі, а наадварот — моцная руская ці літоўская нацыянальная сьвядомасьць.

Кожная з названых тэзаў павінна яшчэ не аднойчы быць прааналізаваная, адчутая, нават адмоўленая. Застаецца неверагодна прыемны фрагмэнт: пра Беларусь зноў напісана сапраўдным беларусам. А як мы баімся пра гэта сказаць ва ўнівэрсытэцкіх аўдыторыях, у акадэмічных інстытутах, на тэлебачаньні і радыё.

Кнігі пра Канстанціна Паклонскага, Саламона Рысінскага, гістарычную памяць і гістарычную сьвядомасьць шляхты, мяшчанства, сьвятарства ВКЛ, сутнасьць і формы сарматцкай культуры павінны быць першачарговымі заданьнямі для дасьледчыкаў. Для беларускай гісторыяграфічнай традыцыі важнейшым зьяўляецца дасьледаваньне позьнесярэднявечнага зладзейства Аляксандра Гваньіні, які скраў тэкст у Мацея Стрыйкоўскага, чым сучаснае прызнаньне, што акадэмічны Інстытут гісторыі гэтым фактам не цікавіцца.

Кніга Алега Латышонка — прыклад рэалізацыі натуральнай прагі ведаць пра сябе больш, чым прапануе афіцыйная ідэалёгія. Генадзь Сагановіч, Алесь Белы, Ігар Марзалюк, Алесь Краўцэвіч, Павал Цярашковіч, Алесь Смалянчук, Валерка Булгакаў — сваёй творчасьцю ўзбагацілі ўласна беларускую гістарыясофію па пытаньнях паходжаньня, станаўленьня і праяўленьня «беларускасьці». Але толькі А.Латышонак, у гэтай кнізе, дадаў упэўненасьці беларускай нацыянальнай ідэі.

*Горадня*

# Гэта была беларуская «Маладая гвардыя»



**Расьціслаў Лапіцкі.**

**Працяг са старонкі 19.**

настаўніцы расейскай літаратуры сказаў, што ў іх ёсьць свая маладая гвардыя, якая змагаецца за Беларусь. У памяці смургонцаў групоўка і засталася пад назвай «Маладая гвардыя».

Першыя арышты былі 2 лютага 1950 г., а прысуды вынесьлі ў сярэдзіне ліпеня. На допытах іх білі, ім трушчылі пальцы, садзілі на ножкі табурэтаў, уводзілі іголкі пад пазногці. Самым вытанчаным было катаваньне кроплямі вады. Галаву стрыглі нагала, ставілі ў кут, дзе нельга было паварушыцца і зьверху рэдка капала вялікая халодная кропля вады. Спачатку было прыемна сярод задухі, а пасьля па галаве біла як вялізным кувадлам. Гэта кітайскі спосаб катаваньня. Не давалі спаць, кожную ноч быў допыт.

Суд стаў чыстай фармальнасьцю. Тым, якія ведалі, але не данесьлі, далі па 10 гадоў, няпоўнагадовай дзяўчынцы далі восем гадоў. Усе астатнія атрымалі па 25 гадоў. Расьціслаў Лапіцкі і Факунда Несьцяровіч былі прысуджаныя да расстрэлу. Лапіцкі выступаў, некаторыя казалі, цэлы дзень. Выступаў як абвінаваўца: пачаў ад мясцовых брыгадзіраў і міліцыянтаў і скончыў самім Сталінам. На судзе трымаўся як герой. Пазьней папрасіў прабачэньня ва ўсіх асуджаных, бо праз яго яны цярпелі і будуць цярпець. Ён быў глыбока веруючым чалавекам. Можа, і пайшоў на сьмерць менавіта праз пачуцьцё адказнасьці і віны за гэтых людзей. Гэта адказнасьць кожнага лідэра, за якім пайшлі на барацьбу і сьмерць. Ня ў кожнага лідэра, праўда, хапае мужнасьці ўзяць на сябе боль людзей, што пайшлі за ім.

У ноч на 28 кастрычніка адбыўся расстрэл. Для Факунды, які ўжо ведаў пра памілаваньне, быў шок, што яго павезьлі на расстрэл з Лапіцкім. Гэбісты зачыталі прысуд аб расстрэле, а пасьля ўказ аб памілаваньні. Гэта быў спэктакль. Застаецца адзін Расьціслаў. Пракурор з партфэлем зачытвае прысуд, а Лапіцкі маўчыць. Усе чакалі, што ён папросіць, каб памілавалі, ужо быў адпаведны ўказ, але ён не зрабіў гэтага.

**«НН»: Месца расстрэлу Лапіцкага вядомае?**

**МЧ:** Найбольш верагоднае — урочышча Красны Беражок пад Вялейкай. Але там ёсьць і расейская вайсковая база, дзе таксама маглі расстрэльваць. Зьвяртацца ў КДБ мне не было сэнсу, бо я археоляг, а не гісторык, які займаецца гэтай тэматыкай.

**«НН»: Пра якую ролю Лапіцкага ў гісторыі Беларусі можна гаварыць сёньня?**

**МЧ:** У антыкамуністычным пасьляваенным руху ў Беларусі я ня ведаю больш моцнай і гераічнай асобы. Яго можна было б кананізаваць, каб ён быў сьвятаром. Гэта быў незвычайны чалавек.

**«НН»: Ці плянуеце далей займацца антыкамуністычным падпольлем?**

**МЧ:** Пасьля гэтых кніжак абсалютная спустошанасьць. Раней у мяне не было такога ні з адною кніжкай. Я лічу, што гэта самыя важныя мае кнігі... І столькі яшчэ застаецца недасьледаванага... У 1950-я ў Беларусі ў сярэднім было 11 абласьцей. Толькі ў абласных судах штогод праходзіла па 40—50 палітычных працэсаў. Паўтысячы палітычных працэсаў штогод. Мы ж ведаем прыкладна пра 10—15 штогод. Яшчэ ніхто не крануў гэтай тэмы.

# Паўстаньне хіпі

Пра першую несанкцыянаваную акцыю моладзі ў паваенным Менску піша **Сяргей Будкін**.

Пачатак 1970-х. У Савецкім Саюзе шырыцца рух хіпі. Моладзь бунтуе, натхняючыся прыкладам чэхаславацкіх і вугорскіх аднагодкаў. Асабліва актыўныя хіпі ў Прыбалтыцы. Пасьля самаспаленьня ковенскага хіпі Ромаса Каланты іх акцыі набываюць выразны нацыянальны характар. Прыбалтыйскія вятры дзьмулі ў Беларусь. Віленскія хіпі прыяжджалі падтрымаць гарадзенскіх сяброў, якія ў жніўні 1971 г. выйшлі пратэставаць супраць дыскрымінацыі з боку дзяржавы. У тыя часы «камсамольскія актывісты» маглі проста на вуліцы злавіць «доўгавалосага» ды пагаліць. Бывалі і страшнейшыя выпадкі. Прыкладам — трагічная гібель менчука Вячаслава Максакава, пра якую сёньня мала хто памятае.

Гэта здарылася 7 красавіка 1970 г. ля кінатэатру «Навіны дня» — цяпер там Малая сцэна Купалаўскага тэатру. Да купкі «доўгавалосае» моладзі падтусаўся незнаёмец ды гукнуў: «Хайль, Гітлер». 18-гадовы хіпі Вячаслаў Максакаў зрабіў яму заўвагу. Незнаёмец выцягнуў з рукава фуфайкі армейскі штых, тыцнуў хлопцу ў жывот і кінуўся ўцякаць. Сябры Вячаслава пабеглі наўздагон, а сам ён застаўся паміраць на прыступках кінатэатру. Забойцу злавілі, пасьля ён быў прызнаны псыхічна неўраўнаважаным і адпушчаны. Гэтае здарэньне выклікала першую маніфэстацыю моладзі ў паваенным Менску.

На пахаваньне Вячаслава зьехаліся сябры з усяе Беларусі. Давялося арандаваць пяць ЛАЗаў, у кожным было па сто чалавек. 9 красавіка сумная працэсія вярталася з Маскоўскіх могілак. У доме па вул.Маркса, дзе жыў Максакаў, сёньня месьцяцца амбасады Ангельшчыны ды Італіі. Рок-музыка Андрэй Плясанаў, тады ўдзельнік менскіх гуртоў «Пінгвіны» і «Пралескі», згадвае, што на наступны дзень пасьля забойства ля кінатэатру «Навіны дня» нехта намаляваў на бруку круг з надпісам «Тут», а на сьцяне дому Вячаслава зьявіўся надпіс «Тут забілі Славіка Максакава». «Мы ўбачылі чалавека, які адціраў надпіс газай. Натуральна, абурыліся і выбеглі з аўтобусаў!» Супрацоўнік камунальнай службы ўцёк, пабачыўшы натоўп раззлаваных «доўгавалосых». Успыхнуў стыхійны мітынг. Абураныя хіпі рушылі да месца забойства.

За ўдзельнікамі пахаваньня сачылі. Імгненна зьявілася міліцыя,




АРХІЎ АНДРЭЯ ПЛЯСАНАВА

**Нефармальная моладзь 70-х любіла фатаграфавацца ля менскага плянэтарыя.**


АРХІЎ АНДРЭЯ ПЛЯСАНАВА

**Ігар Карасталёў (у цэнтры) і Андрэй Плясанаў (зьлева) у пачатку 70-х.**

віжы пачалі здымаць натоўп на фота- і кінастужку (у нетрах КДБ мусіць быць гэты фільм!). Загадвалі разысьціся. Моладзь ня слухалася. Наадварот: счапіла рукі, утварыўшы жывы ланцуг. Айцец Ігар Карасталёў — сёньня настаяцель менскага прыходу іконы Божай Маці, а ў 1970-м музыка ВІА «Залатыя яблыкі» — быў у той счэпцы: «Яны ня ведалі, што рабіць з намі, бо такі інцыдэнт здарыўся ўпершыню. Іх разгубленасьць была навідавоку, для застрашваньня нават пажарную машыну прыгналі, каб нас са шлянгу паліць». Рух у цэнтры гораду перакрылі, прывезьлі салдатаў унутраных войскаў, якія занялі ўсю вуліцу Маркса, у суседніх дварах маніфэстантаў чакалі «газікі»...

У нейкі момант сярод дэманстрантаў зьявіліся «п'яныя» правакатары. Пачалі бэсьціць міліцыю. Моладзь іх адцясьняла. У натоўпе шнырылі «кагэбісты» — аднолькавага росту, у тыповых плашчах і капелюшах. Сутычку, якая скончылася «зачысткай» хіпі, справакавала сама міліцыя, паспрабаваўшы разарваць ланцуг моладзі. «Калі пачалі хапаць усіх ды запіхваць у машыны, мы шмат каго адбілі, скарыстаўшыся агульнай разгубленасьцю», — згадвае І.Карасталёў. Самыя сьмелыя пасьпелі выдраць шлянг з пажарнай машыны. Тых, хто ўратаваўся, да позьняга вечару лавілі па дварах. За кватэрамі актыўных удзельнікаў акцыі сачылі колькі дзён, а ўвесь раён пасьля некалькі месяцаў патрулявала міліцыя.

Праз год выступілі гарадзенскія хіпі. У наступным годзе — яшчэ раз. Абедзьве акцыі скончыліся тым сама, што і менская. Хіпі сталі ворагамі народу. І Максакаў, і літовец Каланта, былі выстаўленыя наркаманамі ды псыхапатамі, у навучальных установах праходзілі мусовыя лекцыі пра «шкоднае ўзьдзеяньне заходняга ўплыву на настроі савецкай моладзі».

Наймацнейшым сродкам «уплыву» была заходняя музыка. У Менску былі дзясяткі гуртоў. Рэпэтавалі хто дзе — у кацельных, падвалах і нават моргах. Сьпяваць па-беларуску было такой самай праявай нонканфармізму, як і перапяваць творы забароненых замежных рок-зорак, згадвае І.Карасталёў. Дарэчы, на ўвесь сьвет вядомая аранжыроўка песьні «Касіў Ясь канюшыну», паводле яго словаў, належыць гурту «Залатыя яблыкі», а ў «Песьняры» прыйшла разам з вакалістам «яблыкаў» — Лявонам Барткевічам.

Адзіным шанцам выступіць на прыстойнай сцэне для музыкаў былі «біг-біт фэсты», што ладзіліся ў радыётэхнічным інстытуце. Кампазытар Уладзімер Кандрусевіч, які граў тады ў гурце «Пане Браце», быў арганізатарам апошняга біг-біт фэсту. На іх выступе фэстываль акурат і згарнулі. «Мы гралі рок-н-рол «Міс Молі», калі на сцэну выйшаў асабіста прадстаўнік ЦК і завесіў заслону. Пасьля мяне выгналі з 3-га курсу кансэрваторыі, хоць я атрымліваў іменную стыпэндыю». Але здарылася нечаканае: у абарону Кандрусевіча ўзьняўся ўвесь курс, і дэкан, каб ня выклікаць новых хваляваньняў, мусіў яго аднавіць. Паўтарэньня пратэстаў хіпі баяліся.

«Замежныя радыёстанцыі падалі менскі мітынг хіпі як сьвядомы выступ моладзі супраць існуючага ладу, але ж акцыя мела стыхійны характар і з палітыкай была мала зьвязаная», — лічыць музычны крытык Зьміцер Падбярэскі, тады студэнт філфаку БДУ. Іншага меркаваньня трымаецца І.Карасталёў: «Мы любілі забароненае. Забойства Максакава падштурхнула наш вальнадумны асяродак да сьвядомага пратэсту».


АРХІЎ АНДРЭЯ ПЛЯСАНАВА

**Менская хіпоўская тусоўка — удзельнікі красавіцкіх пратэстаў 1970-га.**

# Басьнійскія піраміды

Каля басьнійскага мястэчка Вісока месьцяцца самыя старажытныя ў сьвеце піраміды, узьведзеныя прадстаўнікамі невядомай супэрцывілізацыі, сьцьвярджае археоляг-самавук Сэмір Асманагіч. «Басьнійская даліна пірамід» — поўная бздура, кажуць спэцыялісты. Тым ня менш, праект пошуку пірамід падтрымліваецца ўладамі Босьніі-Герцагавіны. Піша археоляг **Мікола Крывальцэвіч**.

Басьнiец Сэмiр Асманагiч паводле адукацыi мэханiк, калiсьцi ён эмiграваў у ЗША ды заснаваў у Тэхасе ўласны бiзнэс. Асманагiч захапляўся археалёгiяй, амаль дваццаць гадоў вывучаў пiрамiды i гiсторыю iндзейцаў майя. Жаданьне археалягiчных адкрыцьцяў прывяло аматара гiсторыi пiрамiд i старажытных цывiлiзацый на радзiму — у Босьнiю. У шматлiкiх iнтэрвiю Асманагiч казаў, што ў Босьнii яго першапачаткова цiкавiлi сярэднявечныя старажытнасьцi каля мястэчка Вiсока, за 35 км на паўднёвы захад ад Сараева. Пасьля ён зьвярнуў увагу на шматлiкiя мясцовыя ўзвышшы. Аглядаючы iх, Сэмiр Асманагiч прыйшоў да думкi, што пад iмi — старажытныя пабудовы. Iдэальна правiльная форма некаторых гор, заявiў Асманагiч, дае падставу меркаваць, што тут знаходзяцца старажытныя пiрамiды.

### Цэмэнт у часы ледавіка

Зусiм фантастычна гучыць заява пра час пабудовы пiрамiд: 12 тысяч гадоў да н.э., у часы апошняга зьледзяненьня ў Эўропе. Нават сам Асманагiч няпэўны адносна храналёгii. «Мы яшчэ не знайшлi арганiчных рэштак, такiх, як косткi, драўнiна альбо вугаль... Такiя аналiзы дапамогуць нам датаваць пабудовы», — разважаў ён, маючы на ўвазе неабходнасьць радыевугляроднага вызначэньня дат узьвядзеньня так званых пiрамiд.

У «Далiне пiрамiд», паводле Асманагiча, чатыры-пяць рукатворных гор, якiя ён называе адпаведна пiрамiдамi «Сонца», «Месяца», «Цмока» i «Каханьня». Пiрамiда «Сонца» мае ў вышыню 213 м, на трацiну вышэй за Вялiкую Пiрамiду ў Гiзе! Асманагiч сьцьвярджае, што гранi пiрамiды «Сонца» iдэальна з’арыентаваны па баках сьвету i маюць дасканалую геамэтрыю.

У красавiку 2006 г. Асманагiч, стварыўшы сваю дасьледчую групу, пачаў раскопкi пiрамiды «Сонца». Iм папярэднiчалi радыялякацыйныя дасьледаваньнi. Аналiзавалiся i фатаздымкi са спадарожнiка. Паводле заяваў Асманагiча, гэта дазволiла пацьвердзiць факт iснаваньня ў пiрамiдах лёхаў. У пiрамiдзе «Сонца», паводле яго слоў, павiнен быць складзены з камянёў пакой. Лёхамi, кажа ён, пiрамiды злучаюцца у адну сыстэму. Як паведамiў Асманагiч, з дапамогаю шахцёраў i геолягаў удалося абсьледаваць участак аднаго з тунэляў, якi цягнецца ў нетрах гары амаль на 3,8 км. Ён кажа, што тунэлi будавалiся з выкарыстаньнем штучнага раствору, а перад вузкiм уваходам знаходзiлася выбрукаваная камянямi пляцоўка.

Абсьледаваньне пiрамiды «Месяца» дазволiла Асманагiчу заявiць, што яму ўдалося знайсьцi там сьляды тэрас, якiя будавалiся з каменных глыб. Па тэрасе праходзiлi неглыбокiя рытмiчна прасечаныя раўкi.

### Што кажуць спэцыялісты?

Пiрамiда — адзiн з тыпаў манумэнтальных збудаваньняў старажытнасьцi. Найбольш iх у Эгiпце. Рэшткi мэсапатамскiх пiрамiд захавалiся на тэрыторыi сучаснага Iрану i Iраку. Археолягi адназначна кажуць: старажытныя народы Эўропы не будавалi пiрамiд. Выключэньне — некалькi пiрамiдальных канструкцый, знойдзеных каля Нiцы ў Францыi. Iх, найхутчэй, пабудавалi рымскiя легiянэры, якiя апынулiся пад моцным уплывам эгiпецкай рэлiгii.

Дагэтуль самымi старажытнымi i вялiкiмi пiрамiдамi сьвету лiчацца эгiпецкiя, найбольш раньнiя якiя пачалi ўзводзiць з каменных блёкаў у часы Раньнiх дынастый (2800 — 2200 г. да н.э.). Таму сэнсацыйныя заявы Асманагiча пра адкрыцьцё ў Эўропе пiрамiд, збудаваных у 12 000 г. да н.э., выклiкалi шквал зьедлiвай i зьнiшчальнай крытыкi.

Спэцыялiсты зьвярнулi ўвагу на ўзровень навуковай квалiфiкацыi i аргумэнтацыi Асманагiча. Яго аматарскiя студыi, напрыклад, скiроўвалiся на вырашэньне праблемы паходжаньня культуры майя. Паводле яго ўяўленьняў, iх пачатак варта шукаць на легендарнай Атлянтыдзе, куды яны прыйшлi з… сузор’я Пляядаў. Адкрытыя на яго думку пiрамiды ў Босьнii — найстарэйшыя ў сьвеце, «мацi ўсiх пiрамiд». Асманагiч параўноўвае iх з аналягiчнымi пабудовамi Мэксыкi i Эгiпту. Для яго яны зьвёны ў адным ланцугу, яшчэ адна «энэргетычная кропка» на целе плянэты.

Марк Роўз, з онлайнавага часопiсу «Archaeology», адносiць артыкулы Сэмiра Асманагiча да жанру фантастычнай археалёгii альбо псэўдаархеалёгii, якая ня мае нiчога супольнага з навукай. Пры элемэнтарнай праверцы канцэпцыi такога кшталту рассыпаюцца.

Узвышшы каля Вiсока — прыродныя геалягiчныя ўтварэньнi, адназначна сьцьвярджаюць вучоныя з факультэту горнай справы i геалёгii Басьнiйскага ўнiвэрсытэту. Тутэйшыя ўзвышшы — прыклад клясычных сэдымэнтальных утварэньняў i адкладаў рознай таўшчынi, якiх шмат у горным раёне Сараева-Зенiца.

У ваколiцах Вiсока самыя раньнiя паселiшчы адносяцца да нэалiту i датуюцца 5 тыс. да н.э. Найбольш яркiя старонкi мясцовай мiнуўшчыны зьвязаны з старажытнымi iлiрыйцамi i насельнiцтвам часоў Рымскай iмпэрыi. У сярэднiя вякi на гары знаходзiлася ўмацаваная рэзыдэнцыя мясцовых каралёў, якая ўзьнiкла на месцы фартэцыi рымскага пэрыяду, а тая ў сваю чаргу будавалася на руiнах больш раньняга паселiшча. Нi з адным з гэтых пэрыядаў, сьцьвярджаюць спэцыялiсты-археолягi, нельга атаясамлiваць будаўнiцтва якiх-небудзь пiрамiд.

Амэрыканскi археоляг, прафэсар Бостанскага Ўнiвэрсытэту Куртыс Ра-




Сэмір Асманагіч і яго піраміда.

нэлз, які спэцыялізуецца на вывучэньні дагісторыі Грэцыі і Балкан, пракамэнтаваў заявы басьнійца так: калі верыць Асманагічу, піраміды будавалі людзі часоў позьняга палеаліту. Але ў той час насельнікі рэгіёну, як дарэчы і іншых частак Эўропы, былі радыя будану са скур і вогнішчу. Манумэнтальная архітэктура тыпу пірамід ня сьнілася ў тыя часы нават жыхарам берагоў Нілу. Паміж 27 000 і 12 000 гадамі да н.э. Балканы знаходзіліся ў зоне апошняга ледавіковага максымуму — пэрыяду зь вельмі халодным і сухім кліматам. Многія горы былі пакрытыя лёдам.

У чэрвені 2006 г., у самы разгар раскопак на т.зв. пірамідзе «Сонца», мясцовасьць наведаў брытанскі археоляг, прафэсар Энтані Гардынг — прэзыдэнт Эўрапейскай асацыяцыі археолягаў. Пасьля агляду гары і месяца раскопак ён заявіў, што гара мае толькі натуральнае паходжаньне. Ён не знайшоў на ёй аніякіх доказаў існаваньня пірамід.

## «Пірамідаідыёты» руйнуюць сапраўдныя помнікі

Рэшткі збудаваньняў, якія час ад часу трапляюцца Асманагічу, па словах спэцыялістаў, маглі застацца ад Сярэднявечча.

Некаторыя экспэрты абразьліва называюць каманду Асманагіча «пірамідаідыётамі». Асманагіч казаў, што ў яго групе археолягаў шмат кваліфікаваных спэцыялістаў з розных краін. Пазьней некаторыя з названых ім навукоўцаў публічна заявілі, што ніколі не падтрымлівалі згаданы праект і не давалі згоду ўдзельнічаць у ім. Асобныя ўдзельнікі праекту праз пэўны час расчараваныя пакінулі каманду Асманагіча.

Нечаканую падтрымку, пасьля наведваньня раскопак, аказаў Асманагічу эгіпэцкі геоляг Алі Баракат. Па-

Працяг на старонцы 26.

### Сем цудаў сьвету — новая рэдакцыя

Зь сямі цудаў сьвету, вызначаных больш за 2000 гадоў таму, засталіся толькі эгіпэцкія піраміды. Швайцарская арганізацыя New 7 Wonders арганізавала галасаваньне, паводле якога паўстане новая сямёрка.

Першы сьпіс сямі цудаў сьвету стварыў грэцкі паэт Антыпатэр Сыданійскі. Гэта быў свайго кшталту даведнік для падарожнікаў. Ён зьмяшчаў сем найбуйнейшых дасягненьняў старажытнай архітэктуры: піраміду Хэопса, сады Сэміраміды, храм Артэміды ў Эфэсе, статую Зэўса ў Алімпіі, Галікарнаскі маўзалей, Калёса Радоскага і Александрыйскі маяк на Фаросе. Ужо ў Сярэднявеччы сямёрка была няпоўная. Адзінае, што захавалася да сёньня, гэта піраміда Хэопса ў Эгіпце.

Прыватная арганізацыя New 7 Wonders Foundation зь сядзібай у Швайцарыі складае новы сьпіс сямі самых прыгожых помнікаў сьвету. Адзін з ініцыятараў акцыі — прафэсар Фэдэрыка Маёр, былы генэральны дырэктар ЮНЭСКО.

На сёньня ў рэйтынгу лідуюць: атэнскі Акропаль у Грэцыі, старажытны горад майя Чычэн-Іца ў Мэксыцы, рымскі Калізей, Эйфэлева вежа ў Парыжы, руіны гораду інкаў Мачу-Пікчу ў Пэру, руіны гораду Пэтра ў паўднёва-заходняй Ярданіі, каменныя статуі на востраве Вялікадня, Стоўнгэндж у Вялікабрытаніі, сьвятыня Тадж-Магал у Індыі, будыская сьвятыня Ан´кор у Камбоджы, крэпасьць Альгамбра ў Грэнадзе ў Гішпаніі, Айя-Сафія ў Стамбуле, будыская сьвятыня Кіёмідзу ў Японіі, Красная Плошча і Крэмль у Маскве, палац XIX-га стагодзьдзя Нойшванштайн у Баварыі, статуя Свабоды ў Нью-Ёрку, статуя Хрыста Збаўцы над Рыё-дэ-Жанэйра, будынак Опэры ў Сыднэі (Аўстралія) і старажытны горад Тымбукту ў Малі.




Эгіпэцкія піраміды **(на фота)** — па-за конкурсам. Ім нададзены статус ганаровага кандыдата пасьля таго, як улады Эгіпту запратэставалі супраць таго, каб гістарычная і неасьпрэчная каштоўнасьць пірамідаў выстаўлялася на галасаваньне.

У інтэрнэт-галасаваньні на сайце http://www.new7wonders.com узялі ўдзел 45 млн. чалавек.

Новую сямёрку дзівосаў сьвету арганізатары зьбіраюцца абвясьціць у дзень «трох сямёрак» — 07.07.07 — у Лісабоне.

**Вольга Данішэвіч паводле gazeta.pl**

# Басьнійскія пірамiды

Працяг са старонкі 25.

водле яго заключэньня, гара зьяўляецца «разнавіднасьцю пірамід, але, напэўна, прымітыўнай пірамідай». Аднак спэцыялісты не далі веры Баракату. На гэта было шмат прычын. Напрыклад, ён паведаміў прэсе, што ў Босьнію ў якасьці экспэрта па пірамідах яго накіраваў вядомы эгіптоляг доктар Зані Хавас — генэральны сакратар Эгіпэцкага камітэту старажытнасьцяў. Пазьней высьветлілася, што паездка ў Босьнію — асабістая ініцыятыва Бараката. Дый Баракат не зьяўляецца спэцыялістам па пірамідах. Сам Зані Хавас глыбока перакананы ў тым, што «басьнійскія піраміды» — геалягічныя ўтварэньні, якія ня маюць аніякай сувязі зь пірамідамі Эгіпту.

Вялікая група басьнійскіх археолягаў і геолягаў у сваім лісьце, апублікаваным у сакавіку 2007 г., адзначае, што раскопкі, якія праводзяцца пад кіраўніцтвам Асманагіча, прыводзяць да разбурэньня неалітычных і сярэдневяковых напластаваньняў. Знойдзеныя артэфакты — чалавечыя косткі, розныя прылады працы, фрагмэнты керамічнага посуду — застаюцца неапублікаванымі і толькі час ад часу дэманструюцца прэсе. Найбольш верагодна, яны адносяцца да сярэднявечнага пэрыяду, калі на гары існавалі адпаведныя фартэцыі. А каманда Асманагіча, ігнаруючы рэальныя факты, спрабуе стварыць вакол сябе арэол таямнічасьці і веру ў мітычную цывілізацыю. Напрыклад, пішуць яны, так званыя «мэгаліты, якія скаціліся долу зь піраміды» альбо рэшткі «старажытных энэргетычных храмаў» ні што іншае як добра дасьледаваныя навукоўцамі басьнійскія надмагільныя камяні-стэцьці. Зробленыя ў раманскім стылі сярэднявяковы рэльеф крыжа ў крузе бачыцца ім «дыяграмай старажытных невядомых мэханізмаў». Спэцыялісты зьвяртаюць увагу на тое, што каманда Асманагіча не надрукавала ніводнай навуковай справаздачы па выніках раскопак.

Нягледзячы на жорсткую крытыку і адсутнасьць доказаў, што горы — гэта піраміды, Асманагіч працягвае шукаць. Пры відавочнай падтрымцы басьнійскіх уладаў ён стварыў фонд «Археалягічны парк: Фонд Басьнійскай піраміды Сонца», які мае свой ўэб-сайт. З дасьледчых праграм фонду на 2006—2010 г. вынікае, што будзе рэканструявацца вяршыня піраміды «Сонца». У 2007 г. пачаліся раскопкі на гары Пльсясэвіца — пірамідзе «Месяца». Наладжваюцца маршруты і праграмы для турыстаў. Віcока стала, на радасьць мясцовых жыхароў і адміністрацыі, адным з самых папулярных у краіне турыстычных цэнтраў. Асманагіч мае намер уключыць Басьнійскую даліну пірамід у сьпіс помнікаў усясьветнага значэньня, што яшчэ больш павялічыць турыстычны паток у Віcока.



Спэцыялісты лічаць: Асманагіч знаходзіць рэшткі сярэднявечных збудаваньняў.

## А ўладам падабаецца

Басьнійскія навукоўцы настойліва раяць прыпыніць дзяржаўную падтрымку праекту, які кампрамэтуе басьнійскую навуку і набывае ўсясьветны скандальны розгалас. Аднак, пэўна, улады маюць ад праекту Асманагіча выгаду. Ім імпануе заява, што Босьнія зьяўляецца «калыскай чалавечай цывілізацыі». Летась выканаўца абавязкаў старшыні ўраду Босьніі-Герцагавіны Сулейман Ціхіч інфармаваў генэральнага сакратара ЮНЭСКА Каіхіто Мацуура пра посьпехі ў дасьледаваньні гары каля Віcока. Мацуура, нібыта, паабяцаў паслаць туды групу экспэртаў, каб паставіць кропку ў справе басьнійскіх пірамід. Аднак сумнеўна, што яны прыедуць у Віcока. Найаўтарытэтнейшыя спэцыялісты ўжо зрабілі сваё заключэньне. Акрамя таго, вядомыя эўрапейскія археолягі ў чэрвені 2006 года накіравалі ў ЮНЭСКА ліст зь меркаваньнем пра бессэнсоўнасьць місіі і марную трату грошай, якія лепш выкарыстаць на іншыя сацыяльныя і культурныя праграмы. Прыезд экспэртаў ад ЮНЭСКА будзе абавязкова выкарыстаны Асманагічам дзеля падтрымкі яго псэўданавуковых ідэй.

Менавіта з-за валюнтарызму ўладаў, якія не зьвяртаюць увагі на ўсеагульную крытыку ідэй і памкненьняў Асманагіча, працягваецца падтрымка авантурнага праекту ў разбуранай вайной Босьніі (маецца на ўвазе басьнійская вайна 1992 — 1995 гадоў — *М.К.*). Згаданы вышэй Энтані Гардынг у сваім лісьце рэдактару лёнданскай «Times» піша пра катастрафічнасьць сытуацыі ў сфэры аховы археалягічнай спадчыны ў Босьніі-Герцагавіне. У краіне, багатай на дагістарычныя і сярэднявечныя старажытнасьці, многія зь якіх засталіся панішчаныя апошняй вайной, купка сумленных людзей безнадзейна спрабуе бараніць археалягічную спадчыну ад тысячаў вандалаў і марадзёраў. Да гэтай пляймы зьнішчальнікаў, — працягвае Гардынг, — дадаюцца багатыя прыхадні-авантурысты, якія карыстаюцца беднасьцю краіны і рэалізуюць свае сумнеўныя праекты.

# Вучань Рушчыца, сябар Сеўрука, сваяк Талстога

27 траўня на Астравеччыну ў вёску Лоша зьехаліся мастакі. Тут, на радзіме вядомага беларуска–польскага мастака Лява Дабжынскага, пройдзе пленэр, прысьвечаны стагодзьдзю творцы.

Сярод гасьцей імпрэзы — мастакі зь Беларусі і Літвы: Алесь Марачкін, Кастусь Качан, Сяргей Емельяновіч, Алег Аблажэй, Крысьціна Балаховіч, Ірына Герасімовіч.

Пра славутага земляка распавядае астравецкі краязнаўца Алесь Юркойць: «Нарадзіўся Леў Дабжынскі ў 1907 г. у Пецярбургу. Яго дзед Антон Дабжынскі быў сэнатарам і царскім дарадцам. Маці была блізкай сваячкай расейскага пісьменьніка Лява Талстога, у гонар якога і назвалі будучага мастака. У Лошы Дабжынскія мелі маёнтак. Леў скончыў Віленскі ўнівэрсытэт, дзе разам зь Міхасём Сеўруком вучыўся ў Фэрдынанда Рушчыца. Вядомую карціну «Жніво» Сяўрук намаляваў у Лошы».

У 1937 г. Дабжынскі выйграў мастацкі конкурс, узнагародай якога была адзіная на ўсю Польшчу стыпэндыя для вучобы ў Парыжы. Але мастак ня мог знайсьці грошай нават на дарогу.

У лістападзе, за тыдзень да выезду ў Францыю, у Лошы здарылася трагедыя…

Да гэтай пары вядуцца спрэчкі. Адны гавораць, што гэта самагубства: маці не дала грошай на дарогу ў Парыж, і сын ня змог перажыць краху Мары свайго жыцьця. Іншыя ня вераць. І выплывае на сцэну лашанскай трагедыі новая злавесная асоба…

Старэючая пані Дабжынкая блізка пасябравала з сваім суседам панам Расальскім — іграком, які прасаджваў грошы за картачным сталом. Прычым не толькі свае, але і палюбоўніцы. Калі грошы скончыліся, стаў прадаваць лес Дабжынскіх. Паніч, высьвятляючы адносіны з Расальскім, паабяцаў перадаць справу ў суд. Ад ганьбы іграка мог выратаваць толькі стрэл…

Пяць дзён паліцыя не давала дазволу хаваць Лява Дабжынскага — некаторыя дэталі на месцы здарэньня не адпавядалі карціне самагубства. Але пані Дабжынская маўчала, а сястра Надзея не магла заступіцца за гонар брата з-за малалецтва…Пахавалі Лява Дабжынскага ля Лашанскай капліцы. Праз пэўны час месца пахаваньня згубілася, і было знойдзенае Адамам Мальдзісам толькі ў 1992 г.



Працягнецца пленэр да 3 чэрвеня. На заключную частку, у часе якой на месцы родавай сядзібы Дабжынскіх усталююць памятны камень, запрошаныя прафэсар Адам Мальдзіс і гісторык Алена Глагоўская з Польшчы.

**Сямён Печанко, Ганна Чакур**

**КАЛЯНДАР**

## Чэрвень

**1 —** Міжнародны дзень абароны дзяцей.

**1 —** 100 гадоў (1907) з дня нараджэньня чэскага філёзафа і дысыдэнта Яна Патачкі, бацькі выдатнай чэскай беларусісткі Францішкі Сокалавай.

**2 —** 200 гадоў (1807) ад бітвы пад Фрыляндам між Напалеонам і расейска-аўстрыйскім войскам, у складзе якога былі беларускія фармаваньні.

**3 —** 100 гадоў таму (1907) цар распусьціў Думу і прызначыў новы недэмакратычны парадак выбараў.

**5 —** Усясьветны дзень навакольнага асяродзьдзя.

**6 —** 250 гадоў таму (1757) пажар зьнішчыў віцебскі Ніжні замак, які пасьля так і не аднавіўся.

**7 —** Сьвята Цела і Крыві Хрыста (Божага Цела) у каталікоў.

**10 —** 100 гадоў таму (1907) францускія інжынэры браты Люм’еры вынайшлі спосаб рабіць каляровыя фатаздымкі.

**13 —** Дзень памяці ахвяраў камуністычных рэпрэсіяў у Літве, Латвіі, Эстоніі.

**20 —** Усясьветны дзень бежанцаў.

**23 —** Купальле.

**24 —** Сьвяты Ян у каталікоў.

**26 —** Дзень ААН.

**26 —** Міжнародны дзень барацьбы з наркотыкамі.

**27 —** 300 гадоў (1707) ад узяцьця Быхава, наймацнейшай фартэцыі ВКЛ, маскоўскім войскам у часе Паўночнай вайны.

**27 —** Усясьветны дзень рыбнай лоўлі.

**29 —** Сьвятыя Пятро і Павал у каталікоў.

# Мова як аптымізм

28 траўня дакумэнталіст Віктар Корзун прадставіў сваю новую стужку «Беларускі фронт, альбо Размовы пра мову».

50-хвілінны фільм глядзіцца на адным дыханьні. Карціна пазбаўлена плаксівага ляманту, абавязковага, калі гутарка заходзіць пра мову. Хоць героям стужкі, каб мову абараніць, прыйшлося прайсьці выпрабаваньні. Маша Каралькова вучылася дома, бо ў школе не знайшлося беларускамоўнай клясы, Аляксей Лапіцкі дамагаўся беларускай клясы для свайго сына Янкі, а дзіцяці Юлі Латушкінай лягапэды ставілі «псыхіятрычны» дыягназ, бо хлопчык размаўляе па-беларуску.

Кожнаму ёсьць, што сказаць. Мова тут як сынонім свабоды, як адкіданьне дыктатуры, аптымізм насуперак катастрофам.

Кожны ня проста абвяшчае пра сваю любоў да «фронту беларускае мовы», але натуральна гэтым дыхае й жыве. І выходзіць моцная рэч. Карціна пра беларускую мову, якую пляжаць, душаць і абсьмейваюць рэжымныя інтэнданты, становіцца сьведчаньнем трываласьці нацыі.

І гэта сучасная дакумэнтальная стужка — годная, інтрыгоўная і цікавая.

Знайсьці новы фільм Віктара Корзуна можна ў месцах традыцыйнага распаўсюду беларускіх кнігаў і відэа.

**Андрэй Расінскі**

# «Залатую галіну» Канаў атрымала малабюджэтная румынская стужка

Драма румынскага дэбютанта абышла карціны Тарантына і Ван Сэнта. Па-за конкурсам паказалі фільм, у якім Пуціна вінавацілі ў забойстве.



Фільм Крыстыяна Мунджу «4 месяцы, 3 тыдні і 2 дні» распавядае пра падпольныя аборты ў камуністычнай Румыніі. Да Канскага фэсту рэжысэр быў нікому не вядомы. Мунджу прызнаўся, што яшчэ год таму ня мог зьняць карціну: не было грошай. Рэжысэр спадзяецца, што яго прыклад натхніць незалежных творцаў.

У пазаконкурсную праграму нечакана была ўключаная не заяўленая раней дакумэнтальная стужка «Бунт. Справа Ліцьвіненкі». Карціну зьняў рэжысэр Андрэй Някрасаў — сябра Аляксандра Ліцьвіненкі, якога атруцілі радыёактыўным палёніем. Някрасаў абвінавачвае ў забойстве Ўладзімера Пуціна, а таксама распавядае пра расейскую павуціну карупцыі.

У 2004-м Каны ўжо скідалі з п'едэсталу аднаго прэзыдэнта — Майкал Мур выкрываў Джорджа Буша. Сёлета надышла чарга для расейскага кіраўніка, да якога ў эўрапейцаў прэтэнзіяў ня менш.

Сярод сюрпрызаў фэсту — узнагарода Этгару Керэту, ізраільскаму пісьменьніку (яго кнігу «Кіроўца аўтобуса, які хацеў стаць Богам» пераклаў па-беларуску Павал Касьцюкевіч). Керэт атрымаў «Залатую камэру» за найлепшы дэбют (фільм «Мэдуза»).

Беларусь на Канскім фэсьце пакуль не прадстаўленая, хоць малабюджэтны румынскі фільм даказвае, што гэта магчыма.

**Андрэй Расінскі**

# «Дзядзька Лявон ідзе!»

26 траўня ў Таварыстве беларускай культуры ў Вільні адбылася імпрэза, прысьвечаная сям'і Луцкевічаў. Згадвалі Лявона, які быў сынам Антона і пляменьнікам Івана Луцкевічаў. Піша віленская настаўніца **Леакадзія Мілаш**.

Лявона Луцкевіча я ведала з канца 80-х. Ад яго даззналася пра Паўліну Мядзёлку, Натальлю Арсеньневу, да яго прыходзіла з вучнямі, яго запрашала на сустрэчы ў беларускую школу ў Вільні.

Лявону Луцкевічу вясною споўнілася б ужо 85 гадоў, ён скончыў знакамітую беларускую гімназію, у часе вайны настаўнічаў у Радашковічах і Баранавічах. Ваеннае ліхалецьце яго закінула ў Прусію, Чэхаславаччыну, Польшчу, дзе яго й арыштавалі. Быў на Калыме, вярнуўся, зьбіраў матэрыял пра Івана і Антона Луцкевічаў, пра Базылянскія муры, беларускую Вільню.

Як было прыемна, калі мы з вучнямі вярталіся з чарговай вандроўкі па той беларускай Вільні, і яны ўбачылі Лявона Луцкевіча, усе хорам закрычалі: «Дзядзька Лявон ідзе!» Гэта было ў сярэдзіне 90-х гадоў — самых плённых ў культурна-грамадзкім жыцьці дзядзькі Лявона.

28 ліпеня 1997 г. перастала біцца яго сэрца. Пахавалі яго побач з помнікам Івану й Антону Луцкевічам на могілках Роса.

На імпрэзе паказалі відэафільм, зьняты падчас адкрыцьця таблічы Пётру Сергіевічу ў траўні 1996 г. Луцкевіч шмат гаварыў тады пра мастака, кватэра якога была цэнтрам беларускасьці на працягу дзесяцігодзьдзяў. Так прыемна было пачуць жывы голас дзядзькі Лявона, а многія з прысутных яго ўбачылі ўпершыню.

Пасьля аб палітычным становішчы ў Беларусі казаў студэнт ЭГУ, палітоляг Артур Юдзіцкі. Шмат было пытаньняў, абмяркоўваўся і Кангрэс дэмсілаў. Пасьля выступіў Андрусь Храпавіцкі, які два гады вучыўся ў ЗША на журналіста. Расказаў пра жыцьцё беларусаў у ЗША — да яго таксама было шмат пытаньняў.

Яшчэ адна імпрэза, прысьвечаная памяці Л.Луцкевіча, пройдзе ў Беларускім культурным таварыстве 28 ліпеня, калі споўніцца дзесяць гадоў па дзядзьку Лявону.

# Вечар беларускае культуры ў Пльзэні

Імпрэза «Пльзэньска-беларускі тузін», адбылася 23 траўня ў кавярні «Інкогніта». Ініцыявалі вечар Віталь Воранаў, студэнт унівэрсытэту ў Пльзэні з чэскімі літаратарамі Маркэтай Чэканавай і Здэнькам Заічкам.

Дзеля лепшага інфармаваньня публікі былі на экране кавярні паказаныя агульныя дадзеныя аб Беларусі з інтэрнэту, дакумэнтальны фільм «Урок беларускае мовы». Група беларускіх студэнтаў падрыхтавала пачастунак: дранікі й бярозавы сок (які, між іншага, усім спадабаўся). Студэнтка Натальля Бяляева сыграла на піяніна твор «Развітаньне з радзімай» кампазытара Агінскага. Пльзэньскі беларус, сп.Аляксандар Даці, прачытаў па-чэску свой пераклад гумарыстычнага твору Ўладзімера Арлова пра сярэднявечную дзейнасьць у Чэхіі князя Жыгімонта Карыбутавіча, які заступаў тут вялікага князя Вітаўта.

Ажыўленая дыскусія на тэму Беларусі й чэска-беларускіх дачыненьняў зацягнулася да позьніх гадзінаў вечара.

**Юрка Станкевіч, «Крывія», Прага**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Незвычайная для вясны сьпёка

Гарачыня і залевы могуць быць прычынай аварыйных адключэньняў электрычнасьці. У сьпякоту дрот, асабліва 10-кілявольтавы, можа награвацца і правісаць. Калі такі провад «ляжа» на дрэва, ёсьць пагроза «зазямленьня». У такіх выпадках на ўчастку ліні электрычнасьць аўтаматычна адключаецца.

Абарваная лінія электраперадач стала прычынай гібелі 45-гадовай мянчанкі і яе 20-гадовага сына. Трагедыя здарылася 28 траўня а 00.20, калі падчас навальніцы ў сталіцы на бульвары Шаўчэнкі паваленае дрэва абарвала дрот. Сын палез цераз дрэва і ўпаў, ударaны токам. Маці кінулася ратаваць і загінула сама...

Сьпёка трымаецца для вясны незвычайная. Усьцяж па Ўсходняй Эўропе былі пабітыя шматгадовыя тэмпэратурныя рэкорды.

## У абарону Горадні падпісаўся кожны трохсоты

Пракурору Гарадзенскай вобласьці Васілю Літвінаву актывісты кампаніі «Выратуем Горадню ад разбурэньняў» перадалі зварот, які падпісалі 789 чалавек. У аўторак каля дзесяці маладых актывістаў прыйшлі да паравога млыну ў цэнтры гораду, які працягваюць разбураць. На месцы маладзёнаў чакалі дзьве міліцэйскія машыны, і актывісты мусілі рэціравацца.

## Сыход, пра які можна пашкадаваць

Кіраўнік місіі АБСЭ ў Беларусі Оке Петэрсан пакідае сваю пасаду. Швэдзкі дыплямат будзе працаваць прадстаўніком Рады Эўропы ва Ўкраіне. Пакуль невядома, хто будзе новым кіраўніком офісу. Згодна з правіламі



арганізацыі, на гэтую пасаду ня могуць быць прызначаны прадстаўнікі краін, зь якімі Беларусь мяжуе.

## Каб не псавалі краявіду

У вёсцы Малашанкі на Гарадоччыне шэсьць закінутых цагляных шматкватэрных дамоў уздоўж трасы «Санкт-Пецярбург—Адэса» закапалі ў вялізныя катлаваны. Каб не псавалі краявіду. Вяскоўцы пачалі абурацца: гэта ж цэгла марнуецца. Адзін з мясцовых жыхароў насьмеліўся нават напісаць скаргу ў Гарадоцкую пракуратуру.

Адказ зь дзяржустаноў уразіў вяскоўцаў напавал: аказваецца, гэта быў «плянавы дэмантаж».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Латышонку — паўстагодзьдзя

27 траўня гісторыку Алегу Латышонку споўнілася 50 гадоў. Спадар Алег — доктар гістарычных навук, старшыня Беларускага гістарычнага таварыства ў Польшчы і, несумненна, найвялікшы (2 м 3 см) беларускі гісторык. Месяц таму ў Беластоку выйшла яго чарговая кніга «Ад белых русаў да беларусаў», прысьвечаная паўстаньню беларускай нацыянальнай ідэі. Рэцэнзію чытайце на старонцы 20.

## 40 000 даляраў і 40 000 еўра — са склепа

Не пашанцавала сталічнай сям'і, у дом да якіх у вёсцы Краснае (Маладачаншчына), завітаў няпрошаны госьць. Здабычу ж ён знайшоў у склепе: удачлівы крымінальнік забраў прыхаваныя 40 тыс. даляраў і 40 тыс. эўра.

## Падаражэла навучаньне ў аўташколах

Цяпер плата (гранічны максымальны тарыф) за навучаньне кіроўцаў катэгорыі А складзе 222,74 тыс. руб., катэгорыі В — 599,08 тыс., катэгорыі С — 1 млн. 86,1 тыс., катэгорыі В-С — 1 млн. 232,02 тыс. У аплату ня ўключаныя выдаткі на паліва.

## За выходныя патанулі 36 чалавек

За 26 і 27 траўня загінулі на вадзе 36 чалавек, у тым ліку сем няпоўнагадовых. Адной з прычын трагедый на вадзе была рэзкая розьніца тэмпэратуры паветра і вады. Пры пагружэньні разгарачанага чалавека ў халодную ваду магчымы спазм сасудаў і кароткачасовая страта прытомнасьці. Больш за 50% тапельцаў былі п'яныя.

## Вярнуліся капуцыны

У мястэчку Ліпнішкі (Івейшчына) прайшлі пасьвячэньні братоў-дыяканаў закону Капуцынаў Генрыха Кучынскага і Андрэя Зуя. Маладыя браты вучыліся ў Польшчы. Айцец Генрых будзе працаваць у Докшыцах. Першае месца працы Андрэя Зуя — Ліпнішкі.

## Апошні званок

Школу сёлета скончылі больш за 94,3 тыс. выпускнікоў 11—12 клясаў і больш за 70,7 тыс. выпускнікоў базавага ўзроўню. Ад 28 траўня ў школах пачаліся выпускныя іспыты. Вучні 11—12 клясаў здаюць расейскую або беларускую мову (на выбар), матэматыку і адзін іспыт на выбар.

Вучні 9-10 клясаў здаюць расейскую і беларускую мовы, матэматыку і гісторыю Беларусі (вусна). Завершацца іспыты 9 чэрвеня, а 12 чэрвеня пачнецца цэнтралізаванае тэставаньне — у гэты дзень пройдзе выпрабаваньне па беларускай мове.

## Ушанавалі памяць случчака

Партызанскі аддзел Юркі Моніча, удзельніка Слуцкага антыбальшавіцкага паўстаньня, дзейнічаў у Барысаўскім павеце аж да 1924 г., калі яго ліквідавала ГПУ. Па яго сьмерці на Барысаўшчыне пайшла традыцыя на соснах выразаць крыжы. Сёлета на сасьне побач зь мястэчкам Бобр быў усталяваны шасьціканцовы крыж з подпісам «Юрка Моніч. 1890—1924. Змагару за Беларусь». У цырымоніі ўзялі ўдзел мясцовыя жыхары, а таксама артысты і грамадзкія дзеячы з сталіцы. Сярод іх былі Алесь Пушкін, Алесь Мазур, Вячаслаў Сіўчык.

**Паводле bulletinonline.org, радыё «Свабода», Звязда, БЕЛТА, Радыё Ватыкану, БелаПАН**




Выражы нажніцамі літары і дапамажы Капітану Танаку скласьці па парадку ўвесь беларускі альфабэт.

А потым паспрабуй скласьці зь літараў словы!
Напрыклад вось так:




http://www.tanakaland.org

Капітан Танака ©

## ІМПРЭЗА

### Сустрэча з Сабілам і Севярынцам

У аўторак **5 чэрвеня а 18.30 на Ўправе БНФ** адбудзецца сустрэча, прысьвечаная году памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў і кампаніі па абароне правоў на свабоду сумленьня. Удзел бяруць былыя вязьні сталінскіх лягераў пастар-эвангеліст Эрнэст Сабіла і прапаведнік Уладзімер Канатуш, хрысьціянскі служыцель Яраслаў Лукасік, якога высылаюць зь Беларусі, а таксама Павал Севярынец. Т.: 571-26-11, 642-47-58

## ФЭСТЫВАЛЬ

### Рок за баброў

**2 чэрвеня ў Бабруйску** ў трэці раз адбудзецца музычны фэст «Рок за БАБРОЎ». **На пляцоўцы каля Палацу Мастацтваў а 16-й стартуе шасьцігадзінны маратон** з удзелам рок-каманд Беларусі і Расеі. Госьці фэсту пачуюць гурты «Ляпіс Трубяцкі», «beZ bileta», «Сініца», «J:МОРС», «Стокс», «Дэймас» (Смаленск), «ТТ-34»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Мастакі і Рыгор Барадулін

**У пятніцу 1 чэрвеня на сядзібе БНФ адкрыцьцё мастацкай выставы, прысьвечанай Рыгору Барадуліну. Удзел бяруць вядомыя беларускія мастакі Валер Шчасны, Алег кавародка, Янка Рамановіч, Уладзімер Сулкоўскі, Алесь і Ігар Марачкін, Эдуард Агуновіч, Віктар Крук, Сьвятлана Бараноўская, Кацярына Мяснікова і іншыя**

## ВЫСТАВЫ

### Купава ў Нью-Ёрку

Беларускі Музэй прадстаўляе пэрсанальную выставу мастака Міколы Купавы. Яго выстава прысьвечаная 125-годзьдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа. Гледачам будзе прапанаваная падборка графічных працаў, зьвязаная з жыцьцём і творчасьцю беларускіх песьняроў. Гэта гравюры, літаграфіі з выявамі краявідаў Вязынкі, Акінчыц, Смольні, Віленскай чыгуначнай калёніі, дзе быў дом нявесты Коласа, Мікалаеўскай карчмы, дому Коласа ў Менску.

Адкрыцьцё выставы і сустрэча з мастаком адбудзецца **3 чэрвеня а 12.30 у грамадзкай залі Сабору Сьвятога Кірылы Тураўскага**. Выстава будзе экспанавацца **да 5 ліпеня**. Уваход бясплатны

### Вежы і замкі Ліпеня

**У Горадні** адкрылася выстава мастака, скульптара Алеся Ліпеня. Аматары мастацтва пабачаць найлепшыя яго творы **ў выстаўнай залі «У Тызэнгаўза»**.

Алесь Ліпень памёр летась на 81 годзе жыцьця. Выставу падрыхтавала жонка, спадарыня Альгерда, і дачка Алена.

Разьбу і скульптуры Алеся Ліпеня можна пабачыць у Горадні, у шмат якіх раённых гарадках, а таксама музэях. Вялікія карціны беларускіх замкаў разьехаліся па ўсім сьвеце. Ліпеневы скульптуры беларускіх клясыкаў і змагароў за незалежнасьць знаходзяцца цяпер у прыватных калекцыях і музэях Беларусі.

Летась Алесь Ліпень пачаў маляваць сваю родную хату ў Борках, але так і ня скончыў карціны — ня стала сілы. Гэтую незакончаную працу таксама змогуць пабачыць наведнікі галерэі

**Паводле радыё «Свабода»**

### Менск Анатоля Тычыны

**У Мастацкім музэі** (вул.Леніна, 20) працуе выстава мастака-графіка Анатоля Тычыны «Мой Менск». А.Тычына — адзін з стваральнікаў беларускай графічнай школы ХХ ст., зь яго імем зьвязнае паўстаньне такіх відаў графікі, як кніжная, станкавая, газэтна-часопісная, экслібрыс

### Італьянскае срэбра ХХ стагодзьдзя

**У мастацкай галерэі «Унівэрсытэт культуры»** (Кастрычніцкая плошча, 1) **да 25 чэрвеня** працуе выстава «Ад дэкаратыўнасьці да дызайну: італьянскае срэбра ХХ ст.». Наведвальнікі выставы здолеюць пазнаёміцца з калекцыяй вырабаў са срэбра асноўных школаў і дызайн-студыяў Італіі, якія займаюцца вырабам твораў з каштоўных мэталаў: De Vecchi, Olga Finzi, San Lorenzo, Cleto Munari, Memphis, Gemma Gioielli.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Піраты Карыбскага мора-3: На ўскрайку сьвету»

**Піраты Карыбскага мора-3: На ўскрайку сьвету**
(Pirates of the Caribbean: At Worlds End)

ЗША, 2007, каляровы, 168 хв.

**Рэжысэр:** Гор Вэрбінскі

**Ролі выконваюць:** Джоні Дэп, Кіра Найтлі, Арланда Блум, Джэфры Раш, Джонатан Прайс, Чоў Юн-Фат, Біл Найі, Том Галандэр, Кіт Рычардз

**Жанр:** Прыгоды

**Адзнака:** 8,5 (з 10)

Трохгадзінны дыснэеўскі атракцыён. Пірацкая рамантыка, каханьне, звышвідовішчныя бойкі, містыка з арт-гаўзнымі элемэнтамі (Джоні Дэп і ягоныя клоны), гэгі, старажытныя міты, касьцюмная драма (мастакі пабудавалі горад XVII ст.).

На экране зьяўляецца й прататып Джэка Вераб'я — рокер-наркаман Кіт Рычардз у ролі татусі Джэка.

Усе героі падманваюць адзін аднаго, падстаўляюць, пераходзяць на супрацьлеглы бок (што суправаджаецца бойкамі й уцёкамі) — словам, паводзяцца як добрапрыстойныя піраты.

Над марскою варонкай счапіліся два караблі, малпа-артылерыст па наводцы папугая вядзе абстрэл ворагаў, шалёнае вясельле пад звон мячоў, разумныя камяні-крабы, аграмадная багіня Каліпса — і гратэскны пірацкі Інтэрнацыянал.

Усе на абардаж кінатэатраў!

**Андрэй Расінскі**




# ГІСТОРЫЯ Ў «НН»

*Травень 2007*


**Гэта была беларуская «Маладая гвардыя».**
Гутарка зь Міхасём Чарняўскім пра Расьціслава Лапіцкага, лідэра антыкамуністычнага падпольля на Мядзельшчыне ........ 18

**Ад белых русаў да беларусаў.**
Рэцэнзія на новую кнігу Алега Латышонка ........ 20

**Паўстаньне хіпі.**
Гісторыя першай несанкцыянаванай моладзевай акцыі ў Менску ........ 22

**Басьнійскія піраміды.**
Пра археалягічную спэкуляцыю стагодзьдзя піша Мікола Крывальцэвіч. ........ 24


**ЗА БЕЛАРУСЬ!**

## У Карэліцкай бальніцы прадаюць паэзію

Мясцовы паэт В.М. выдаў вершаваны зборнік, прысьвечаны раённай бальніцы. Знайшлося там месца й вершу, адрасаванаму вышэйшай дзяржаўнай асобе, дзякуючы якой нібыта карэліцкая мэдыцына лепшае з кожным днём. Цяпер той зборнік у прымусова-добраахвотнай форме распаўсюджваюць сярод пэрсаналу бальніцы. Нядорага — усяго восем тысяч. У адваротным выпадку пагражаюць не працягнуць кантракт. Паабуралiся санітаркі з дактарамі ды пайшлі набываць паэзію. Сямейныя, што ўдвох працуюць у бальніцы, шчасьлівейшыя — маюць права набыць адну кніжку ў сям'ю. Карэліцкая больніца ўжо «праславілася» некалі тым, што пэрсанал прымусілі выдаткаваць прэміяльныя на выпіску дзяржаўных газэт.

**Пацыент**




**Віншуем Рамана і Насту** Маладзяшыных з нараджэньнем дачушкі Антаніны.

Калегі–нашаніўцы



Газэта «Наша Ніва»

шукае карэктара
на пастаянную працу

Зьвяртацца на e–mail:

**nn@nn.by**, **nn@promedia.by**.

Або праз тэлефоны:

**(017)284-73-29**, **613-32-32**, **707-73-29**.






# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»**, паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас і падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СПАЧУВАНЬНЕ

**Выказваю глыбокае спачуваньне** сям'і Ўладзі Катkоўскага. Нягледзячы на свой кароткі век, ваш сын і брат зрабіў вельмі шмат для сваёй Бацькаўшчыны! Па ім застанецца доўгая і сьветлая памяць ня толькі ў тых, хто ведаў яго асабіста, але й тых, хто, дзякуючы яму, празь сеціва далучаўся і далучаецца да беларушчыны. З глыбокімі спачуваньнямі, Алесь Лагвінец

### БАСОВІШЧА

**Жадаючыя** запісацца на паездку на рок–фэст «Басовішча», тэлефануйце: 622–57–20, 578–97–08

### ТАМАДА

**24 жніўня** адбудзецца вясельле з нагоды шлюбу. Патрэбны добры тамада. Разгледзім усе прапановы. Т.: 307–22–15 (Арцём), 119–84–66 (Ірына)

### ВІТАНЬНІ

**Віншую** найлепшага татачку ва ўсім сьвеце — Алеся Ложачніка з Днём Народзінаў! Хай жыцьцё нясе толькі замілаваньне, шчырасьць і добры настрой. Дачка Даша

### КАНТАКТЫ

**8 чэрвеня з 17 да 19** на ўправе БНФ аўтограф і фотасэсія гурту NRM з нагоды выхаду новага альбому "06". Уваход вольны.

**Ці ёсьць у Воршы беларускамоўныя суполкі?** (літаратурныя ці яшчэ якія. А то ж няма з кім размаўляць на роднай мове!!!!!!!!!!) elza_ok@tut.by

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Новы альбом** N.R.M.! Т.: 649–08–88. Таксама пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў

**Падкажыце**, дзе можна знайсьці/набыць копіі (DVD ці video) экранізаваныя творы беларускай клясыкі, напрыклад, «Дзікае паляваньне караля Стаха» ды іншыя фільмы. jurha@op.pl

### ПРАЦА

**Дзяўчына-філялягіня** шукае любую працу, зьвязаную з тэкстамі. Вялікі вопыт працы. Т.: 174–98–91

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў падарожжа «Браслаўскі край» 3 чэрвеня (нядзеля) па маршруце: Менск–Мосар–Слабодка–Плюсы–Браслаў–Браслаўскія азёры–Опса–Пеліканы–Дрысьвяты–Менск. 22–25 чэрвеня: Львоў і замкі. 13–16 ліпеня: Грунвальд–Мальбарк–Гданьск. Т.: 292–54–58; GSM 622–57–20; 509–12–16

**«НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ**

Сьвяцейшы Сынод патрэбаваў ад тых сьвяшчэньнікаў — дэпутатаў Дзяржаўнае Думы, каторыя належаць да левых партый, каб яны выйшлі з тых партый і прылучыліся да правых, або былі беспартыйнымі правымі. Ім заявілі, што калі яны да 18 мая ня выйдуць з партый, то ня могуць быць больш сьвяшчэньнікамі.

**«Наша Ніва». №20. 1907**


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф–рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.


12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 30.05.2007.
Замова № 2937.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.